ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 35-ы
№ 52 (2105)
28 чэрвеня 1966 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЛЕНУМ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

«Край балот... О, край, — калі ж ты станеш краем фабрык дымных і машын!..» Так пісаў пра Беларусь у першыя гады Савецкай улады Паўлюк Трус. Здзейснілася мара паэта — стала цяпер Беларусь краем магутнай індустрыі, энергетыкі, знойдзены ў нетрах яе, здабываюцца калійная соль, нафта...

Адступіла перад людзьмі і спрадвечная багна. За гады Савецкай улады ў рэспубліцы асушана звыш мільёна гектараў зямель, пры тым толькі за апошняе пяцігоддзе больш як 700 тысяч гектараў. Яны сталі ўрадлівымі палеткамі, шчодра плацяць за рупнасць людзям. Вось адзін толькі прыклад. У калгасе імя Леніна Пінскага раёна, дзе старшынёй Герой Сацыялістычнай Працы У. С. Козыр, у мінулым сямігоддзі ў сярэднім з кожнага асушанага гектара тарфянікаў атрымана: збожжавых — амаль 20 цэнтнераў, бульбы — 223, цукровых буракоў — 356, кукурузы — 321 і сена шматгадовых траў — 46 цэнтнераў. Сапраўды залатое дно!

Але балот і забалочаных зямель, якія патрабуюць асушкі, у рэспубліцы яшчэ вельмі многа — каля 6,5 мільёна гектараў. Асушыць іх, зрабіць іх урадлівымі — такім клопатам была прасякнута работа Пленума Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі, які адбыўся 24—25 чэрвеня г.г. Удзельнікі яго абмяркоўвалі вынікі майскага (1966 года) Пленума ЦК КПСС, вырашалі задачы па далейшаму развіццю меліярацыі зямель. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў сакратар ЦК КПБ Ф. А. Сурганаў.

У адпаведнасці з Дырэктывамі XXIII з'езда партыі майскі Пленум ЦК КПСС прадугледзеў асушыць на працягу 1966—1970 гадоў у Беларусі 1 550 тысяч гектараў залішне ўвільготненых зямель. На правядзенне гэтых работ спатрэбіцца затраціць звыш мільярда рублёў — гэта значна больш, чым было затрачана сродкаў на меліярацыю за ўсю папярэднюю гісторыю Беларусі.

Па-гаспадарску, удумліва абмяркоўвалі ўдзельнікі пленума гэтую надзённую праблему. Адзначалі поспехі, вышуквалі рэзервы, прынцыпова крытыкавалі недахопы.

Пленум ЦК КПБ абмеркаваў таксама даклад Старшыні Савета Міністраў БССР Ц. Я. Кісялёва «Аб ходзе капітальнага будаўніцтва і вытворчасці будаўнічых матэрыялаў у рэспубліцы».

З прамовай на пленуме выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў.

Па абмеркаваных пытаннях пленум прыняў пастановы.

Пленум прыняў пастанову аб перайменаванні Прэзідыума ЦК КПБ у Бюро ЦК КПБ.

Нашы інтэрв'ю

МАНГОЛІЯ—БЕЛАРУСЬ

Беларусь і Манголію падзяляюць многія тысячы кіламетраў. Але вялікая адлегласць — не перашкода для дружбы. Паміж народамі-сябрамі здаўна ўстанавілася добрае супрацоўніцтва, разнастайныя эканамічныя і культурныя сувязі. Больш трыццаці прамысловых прадпрыемстваў Беларусі выконваюць заказы Манголіі на пастаўку машын, станкоў, электраабсталявання, гадзіннікаў, падшыпнікаў і іншых прамысловых вырабаў.

Пра ўсё гэта і расказвае нам намеснік старшыні Беларускага таварыства дружбы і культурных сувязей з зарубежнымі краінамі Валянціна Аляксееўна Чарняўская, да якой карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» звярнуўся ў сувязі з маючымі адбыцца з 5 па 10 ліпеня Днямі мангольскай культуры ў Беларусі.

— Мы пастаянна абменьваемся інфармацыйнымі матэрыяламі, фотавыстаўкамі, літаратурай, перыядычнымі выданнямі, грампласцінкамі,—гаворыць В. Чарняўская. — Напрыклад, у 1962 годзе ў Манголіі былі адзначаны юбілеі народных пісьменнікаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. У нашай рэспубліцы таксама адзначаюцца нацыянальныя святы Манголіі і юбілеі выдатных дзеячоў мангольскай культуры. У перакладзе на беларускую мову былі выдадзены мангольскія народныя казкі, вершы паэтаў Д. Тарва, Г. Цэндджаева і іншых. У Мінску паспяхова прайшлі гастролі мангольскага спевака Пурэўдоржа Цэвэгжаева і артыстаў цырка.

Некаторы час назад рэдакцыя прапаганды Беларускага радыё правяла радыёвікторыну «Ці ведаеце вы Мангольскую Народную Рэспубліку?» З усіх куткоў Беларусі рабочыя, інжынеры, урачы, школьнікі прыслалі больш за 400 адказаў на гэтую віктарыну. Многія радыёслухачы афармілі вельмі цікавыя альбомы з малюнкамі, картамі, каляровымі ўкладкамі. Гэта сведчыць аб вялікай цікавасці да культурнага жыцця Манголіі.

— Як будуць праходзіць Дні мангольскай культуры? — пацікавіўся карэспандэнт.

— Яны адкрыюцца ўрачыстым вечарам у зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У канцэрце прымуць удзел мангольскія і беларускія артысты. У кінатэатры «Мір» кінафільмам «Яго завуць Сухэ-Батар» пачнецца фестываль мангольскіх фільмаў. У бібліятэцы імя Леніна будзе афармлены вялікі стэнд, прысвечаны выданням кніг мангольскіх пісьменнікаў на беларускай і рускай мовах.

У Доме работнікаў мастацтваў адкрыецца выстаўка мангольскай народнай творчасці. Дзеячы выяўленчага мастацтва рэспублікі, аматары змогуць пазнаёміцца з творчасцю мангольскіх мастакоў. У салон-магазіне будуць выстаўлены работы О. Цэвэгжава «Бой жарабцоў», Г. Одана «Атрад Хас Батара», У. Ядамсурэна «Партрэт Сухэ-Батара», скульптуры Жамба «Утаймавальнік коней», «Бандар» і г. д.

Для ўдзелу ва ўрачыстасцях у Беларусь прыбудуць работнікі пасольства Мангольскай Народнай Рэспублікі ў СССР і дэлегацыя Таварыства мангола-савецкай дружбы, а таксама група мангольскіх артыстаў.

Дні культуры будуць адзначацца таксама ў Гомелі, Брэсце, Магілёве. Тут адбудуцца літаратурныя і музычныя вечары, прысвечаныя мангольскай культуры. Будуць экспанавацца фотавыстаўкі, прысвечаныя дасягненням Мангольскай Народнай Рэспублікі ў будаўніцтве сацыялізма.



Чыстым воскам жыта налілося...
Гаспадар зямлі ідзе па гонях.
Перад ім схіляецца калоссе,
Быццам дзякуе зямным паклонам.

Фота Ф. КАЗЛОВА.

НОВЫЯ ІМЁНЫ ПЕРАМОЖЦАЎ

НА МІЖНАРОДНЫМ КОНКУРСЕ ІМЯ ЧАЙКОЎСКАГА

Журы конкурсу вакалістаў пад старшынствам прафесара А. В. Свешнікава 26 чэрвеня ўвечары аб'явіла імёны новых лаўрэатаў Трэцяга Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага. Сярод мужчынскіх галасоў першай прэміяй адзначан Уладзімір Атлантаў (СССР). Другая прэмія прысуджана Мікалаю Ахотнікаву (СССР). Дзве трэція прэміі атрымаюць Сімон Эстэс (ЗША) і Канстанцін Лісоўскі (СССР). Чацвёртая прэмія будзе ўручана Вацлавасу Даўнорасу (СССР), пятая прэмія — Васіле Марціною (Румынія).

Сярод вакалістак першай прэміяй адзначана Джэйн Марш (ЗША). Дзве другія прэміі атрымаюць Вераніка Тайлер (ЗША) і Эвеліна Стойцэва (Балгарыя). Трэцяя прэмія прысуджана Марыі Біешу (СССР).

Ганаровыя дыпломы конкурсу будуць уручаны Святлане Данілюк (СССР), Адэліне Казловай (СССР), Барбары Рондэл (ЗША) і Марыі Слэцінару (Румынія).

Такім чынам, вядомы ўжо пераможцы трох відаў спаборніцтва музыкантаў. Цяпер сцэна цалкам аддадзена піяністам, яны завяршаюць конкурс.

Нагадаем, што да трэцяга, заключнага, тура журы дапусціла чатырнаццаць выканаўцаў, сярод якіх пяць з СССР, па тры з Францыі і ЗША і па адным з ЧССР, ГДР, Бельгіі.

Акрамя абавязковага канцэрта Чайкоўскага, будуць выконвацца творы Бетховена, Брамса, Ліста, Рахманінава, Пракоф'ева, Сен-Санса, Шапэна.

Спаборніцтвы ў разгары. Штовечар выступаюць па тры музыканты. Музычны свет з нецярплівасцю чакае новых вестак з Масквы.

ПЕРАД ГАСТРОЛЯМІ КІЕЎСКАГА ТЭАТРА ІМЯ ФРАНКА Ў МІНСКУ

Народная артыстка СССР Н. Ужвій.

Народны артыст СССР Я. Панамарэнка.

Народная артыстка СССР П. Куманчэнка.

Народны артыст СССР Ул. Дальскі.

Народная артыстка УССР В. Кусенка.

Народны артыст УССР П. Сергіенка.

Народны артыст УССР М. Пакаціла.

Слова да мінскіх гледачоў

Наталля УЖВІЙ,
народная артыстка СССР

Кіеўскі дзяржаўны ордэна Леніна акадэмічны ўкраінскі драматычны тэатр імя Івана Франка едзе на гастролі ў сталіцу братняй Беларусі — Мінск.

Вось ужо каля паўстагоддзя нясе тэатр сцяг самага перадавога ў свеце савецкага мастацтва.

За гады свайго існавання франкаўцы аб'ездзілі шмат гарадоў і рэспублік. Пабывалі яны і за граніцаю — у Польскай Народнай Рэспубліцы...

А вось да роднай сястры Украіны — у Беларусь—наш тэатр завітае ўпершыню.

Вядома, усе мы, у тым ліку і я, хвалюемся перад будучай першай сустрэчай.

Тэатр пакажа ў час гастролей спектаклі «Старонка дзённіка» і «Калінавы гай» па п'есах А. Карнейчука, «Спыніцеся!» па п'есе І. Рачады, «Фартуна» па п'есе М. Заруднага, «Фараоны» па п'есе А. Каламійца, «Крывёю сэрца» па матывах аповесці А. Бойчанкі «Маладосць», «Бесталанная» І. Карпенкі-Карага, «Цыганка Аза» М. Старыцкага, «Антыгону» Сафокла.

Яны лепш за ўсё раскажуць пра нашы сцэнічныя дасягненні, пра творчыя імкненні калектыву.

У гэтых спектаклях выступяць нашы майстры — народныя артысты СССР П. Куманчэнка, В. Дальскі, народны артыст УССР А. Кусенка, П. Сергіенка, М. Пакаціла, заслужаныя артысты УССР А. Гашынскі, А. Давыдзенка, В. Дашэнка, Н. Капяржынская, М. Заднепроўскі, А. Амяльчук, Н. Панасьеў, С. Станкевіч, Ю. Ткачэнка, Г. Яблонская, Н. Якаўчэнка і многія іншыя, якія ўзвялічваюць сваёй натхнёнай творчасцю славу ўкраінскага тэатра.

Хочацца сказаць пра нашу моладзь. У трупе нямала маладых акцёраў. Многія з іх ужо заваявалі прызнанне гледачоў. Святлана Каркошка іграе з вялікім поспехам у трагедыі Сафокла «Антыгона». З ігрой другой маладой таленавітай актрысы Наталлі Латоцкай гледачы пазнаёмяцца ў спектаклях па п'есах А. Карнейчука. Значных творчых поспехаў дамагліся і маладыя артысты І. Цараградская, А. Уласава, Л. Тамашэўская, В. Цесля, М. Герасіменка, П. Маразенка, Г. Сліпенка, Н. Заднепроўскі, С. Аляксеенка.

Знаёмячы мінскіх гледачоў з імёнамі артыстаў, з якімі ім давядзецца сустрэцца, я не магу не сказаць з павагай пра тых, з кім непарыўна звязаны слаўны шлях тэатра, яго арганізатара і нязменнага мастацкага кіраўніка, акцёра народнага артыста СССР Гната Юру, пра цудоўных майстроў А. Бучму, Ю. Шумскага, Д. Мілюценку і многіх іншых, якія ўзбагацілі савецкае мастацтва сваімі шчодрымі талентамі. Іх спадчына неўміручая!

Звяртаючыся да беларускіх гледачоў, мне хочацца выказаць упэўненасць, што гастролі старэйшага ўкраінскага тэатра будуць аднолькава плённымі як для мінчан, так і для ўкраінскіх артыстаў.

Відаць, сустрэчы франкаўцаў з мінчанамі не абмяжуюцца сценамі тэатра. Мы сустрэнемся з рабочымі, інтэлігенцыяй, вучнямі беларускай сталіцы непасрэдна на вытворчасці, у вышэйшых навучальных установах, школах. Такія сустрэчы — традыцыя франкаўцаў, якой яны не здраджваюць і на гастролях.

Я хачу закончыць сваё выступленне словам пажадання: добрага здароўя і новых поспехаў у натхнёнай працы працоўным нашай братняй Беларусі — роднай любімай сястры!

НАРОДНЫЯ УНІВЕРСІТЭТЫ ЗАВЯРШАЮЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД

Карэспандэнт Агенцтва друку Навіны звярнуўся да намесніка старшыні праўлення Усесаюзнага таварыства «Веды» Людмілы Дубровінай з просьбай адказаць на некаторыя пытанні ў сувязі з тым, што ў бліжэйшыя дні завяршаецца чарговы навучальны год у народных універсітэтах краіны.

Пытанне: Якое развіццё ў Савецкім Саюзе атрымалі народныя універсітэты?

— У краіне працуе больш як 16 тысяч народных універсітэтаў, у якіх навучаецца больш трох мільёнаў чалавек. Час пацвердзіў поўную жыццёвасць гэтай дзейснай і эфектыўнай формы адукацыі і выхавання працоўных, пашырэння іх палітычнага і культурнага кругагляду.

Першыя народныя універсітэты, як своеасаблівыя грамадскія навучальныя ўстановы, пачалі ўзнікаць у нашай краіне каля дзесяці год назад. А цяпер яны з'яўляюцца даволі шырокай сеткай пазашкольнай адукацыі працоўных. Іх колькасны рост наглядна сведчыць аб імкненні савецкіх людзей да самых разнастайных галін ведаў.

Сёння існуе каля 25 відаў універсітэтаў. Найбольшае развіццё атрымалі народныя універсітэты літаратуры і мастацтва, педагагічных і медыцынскіх ведаў; шырыцца сетка універсітэтаў тэхнічнага прагрэсу, тэхніка-эканамічных і сельскагаспадарчых ведаў, дзяржавы і права. Рознабаковасць запатрабаванняў і інтарэсаў розных слаёў працоўных вядзе да далейшай дыферэнцыяцыі народных універсітэтаў, да з'яўлення іх новых відаў і тыпаў.

У дзейнасці народных універсітэтаў прымаюць удзел больш 120 тысяч вучоных, настаўнікаў, урачоў, інжынераў, юрыстаў, работнікаў культуры і мастацтва, наватараў вытворчасці. Усе яны выкладаюць на грамадскіх асновах.

Пытанне: Што было новага ў рабоце народных універсітэтаў у навучальным годзе, які толькі што закончыўся?

— Працягвалася далейшае развіццё сеткі народных універсітэтаў з улікам запатрабаванняў і патрэб працоўных, эканамічнага і культурнага развіцця краіны.

У мінулым навучальным годзе быў праведзены Усесаюзны грамадскі агляд народных універсітэтаў. Да работы народных універсітэтаў былі прыцягнуты новыя кадры кваліфікаваных лектараў і выкладчыкаў, палепшылася вучэбна-выхаваўчая работа ў іх. Агляд даў магчымасць выявіць і абагуліць вопыт лепшых народных універсітэтаў і зрабіць яго агульным здабыткам.

У мінулым навучальным годзе былі ўдасканалены дзеючыя і створаны новыя вучэбна-тэматычныя планы і праграмы народных універсітэтаў. Гэтая работа будзе працягвацца і ў новым навучальным годзе. Побач з вывучэннем розных дысцыплін па праграме вучэбнымі планамі ў новым навучальным годзе ва ўсіх народных універсітэтах прадугледжана глыбокае вывучэнне матэрыялаў XXIII з'езда КПСС.

Пытанне: Якія мерапрыемствы маецца на ўвазе ажыццявіць для далейшага развіцця народных універсітэтаў?

— Побач з далейшым планамерным развіццём сеткі народных універсітэтаў галоўнай задачай мы лічым паляпшэнне якасці іх работы. Для абмену вопытам выкладчыкаў і лектараў народных універсітэтаў педагагічных ведаў праводзяцца міжрэспубліканскія семінары-нарады. У бліжэйшы час такія семінары-нарады будуць праведзены для народных універсітэтаў Беларусі і рэспублік Прыбалтыкі ў Мінску, для рэспублік Закаўказзя — у Баку.

Народныя універсітэты адыгрываюць усё большую ролю ў камуністычным выхаванні працоўных. Адна з важных задач цяпер — паляпшэнне кіраўніцтва імі з боку рэспубліканскіх і мясцовых арганізацый. Вопыт паказаў, што народныя універсітэты добра працуюць там, дзе імі добра кіруюць і аказваюць штодзённую дапамогу.

РАБОТА НАПЕРАДЗЕ—ВЯЛІКАЯ

Наша газета паведамляла ўжо аб арганізацыі абласнога аддзялення Саюза мастакоў БССР у Гомелі. Днямі адбыўся арганізацыйны сход аддзялення, на якім выбрана праўленне.

Прапануем увазе чытачоў інтэрв'ю, узятае нашым карэспандэнтам Д. Радзінскім у старшыні праўлення Валянціна Ягорава.

Уласна кажучы, звонку тут пакуль што нічога не змянілася. Тыя ж вытворчыя майстэрні, тыя ж людзі, тая ж работа — пано, партрэты, эскізы афармлення музеяў і клубаў. Але гэтае першае ўражанне адразу ж знікае, як толькі пачынаеш гаварыць з мастакамі. Адчуваеш, наколькі змяніўся агульны настрой. Цяпер у гомельскіх мастакоў свая абласная творчая арганізацыя — з утварэннем аддзялення Саюза мастакоў ва ўсіх звязаны вялікія надзеі. Іменна таму так сур'ёзна абмяркоўвалі яны на арганізацыйным сходзе кандыдатуры членаў праўлення — ад іх жа шмат у чым залежыць поспех работы.

— Хто акрамя вас, увайшоў у праўленне? — такім было маё першае пытанне да Валянціна Ягорава.

— Міхаіл Навіцкі — намеснік старшыні праўлення, Барыс Кузьмічоў — адказны сакратар, члены праўлення — Яўген Пакаташкін, Дзмітрый Алейнік, Мікалай Казакевіч. Гэта ўсё людзі творчыя, цікавыя мастакі.

Што датычыць самога Валянціна Ягорава, то яго работы вядомыя аматарам беларускай графікі. Пасля сканчэння Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута ён праілюстраваў некалькі выданняў, удзельнічаў у рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках.

— У майстэрнях Мастацкага фонду, — працягвае В. Ягораў, — цяпер працуюць трыццаць шэсць чалавек, з іх чатырнаццаць членаў Саюза мастакоў і чатыры кандыдаты ў члены саюза. Дарэчы, на першым пасяджэнні праўлення мы прынялі ў члены саюза двух нашых таварышаў — А. Осіпаву і А. Осіпава. Яны абое пасля сканчэння Палехскага мастацкага вучылішча ўжо некалькі гадоў працуюць у Гомелі. Трэба сказаць, што ў нашай маладой арганізацыі ёсць перспектывы далейшага росту.

— А як мяркуе аддзяленне спрыяць творчаму росту мастакоў?

— Спрыяць творчаму росту мастакоў — гэта наша асноўная задача. У гэтым — сэнс заснавання нашага аддзялення. Цяпер у нас значна больш магчымасцей для арганізацыі выставак, у тым ліку і персанальных. А гэта, як вядома, найлепшы стымул для творчасці. Толькі што ў нас закрылася выстаўка твораў нашага старэйшага мастака, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Б. Звенігродскага. Мы правялі шырокае яе абмеркаванне. Цяпер у памяшканні майстэрань экспануюцца работы І. Юдзянок. Гэтая выстаўка новага нашага таварыша наладжана па рашэнню праўлення. У нашых планах—персанальная выстаўка твораў Ф. Махаўцова, групавая — М. Казакевіча, Д. Алейніка, В. Гарачава, Я. і Л. Пакаташкіных. У канцы года мяркуем правесці абласную выстаўку. Усе гомельскія мастакі актыўна рыхтуюцца да выставак. Наша аддзяленне, можна спадзявацца, паспрыяе наладжванню больш прынцыповага адбору работ на выстаўкі і больш кваліфікаванага іх разгляду. Нарэшце — і гэта вельмі істотна — мы здолеем забяспечыць мастакоў творчымі майстэрнямі. Ужо ёсць рашэнне аблвыканкома аб перадачы нам мансард па праспекце імя Леніна. Пераабсталяваць іх аддзяленне здолеем на свае сродкі. Цяпер мы атрымалі магчымасць часцей пасылаць мастакоў у творчыя камандзіроўкі.

Я задаю традыцыйнае пытанне аб планах на будучыню.

— Вы бачыце, — паказвае В. Ягораў на пакой, у якім мы сустрэліся,— умовы для работы ў нас пакуль што няважныя. Таму першая наша задача — будаўніцтва камбіната вытворча-афарміцельскіх работ. Мы ж цяпер маем права выкарыстоўваць частку прыбытку — а прыбыткі мы даём немалыя — на пашырэнне вытворчых памяшканняў. Думаем таксама аб'яднаць нашу майстэрню з мастацкімі майстэрнямі фабрыкі бытавых паслуг. У камбінаце будуць працаваць народныя ўмельцы — рэзчыкі па дрэву, інкрустатары, ткачы...

— Можа тады, нарэшце, можна будзе купіць у магазіне работу гомельскага мастака, якая палюбілася?— пытаюся, прыгадваючы, як на абласной выстаўцы многія наведвальнікі цікавіліся, дзе можна набыць «Бярозку» В. Ягорава, гравюры Я. Пакаташкіна, Б. Кузьмічова.

— Пра гэта мы таксама падумалі. У рашэнні аблвыканкома, пра якое я ўжо казаў, ёсць і такі пункт: выдзеліць памяшканне для мастацкага салона. А з часам мы будзем мець і свой магазін.

— А як абстаяць справы з дапамогай самадзейным мастакам Гомельшчыны?

— І раней, і цяпер да нас часта прыходзяць аматары выяўленчага мастацтва — па параду і дапамогу. Мы ім ніколі не адмаўляем, а лепшых запрашаем прымаць удзел у выстаўках. Нашы таварышы на грамадскіх асновах кіруюць аматарскімі студыямі выяўленчага мастацтва. Напрыклад, М. Казачэнка займаецца ўжо некалькі год з самадзейнымі мастакамі ў Палацы культуры імя Ул. І. Леніна, М. Навіцкі — у аблпраекце...

Апошняе пытанне:

— Вашы асабістыя творчыя планы?

— Асноўнае ў мяне, як і ва ўсіх,— падрыхтоўка да слаўнага 50-годдзя Савецкай улады. Як і ўсе, рыхтуюся перш за ўсё да абласной выстаўкі...

Самая маладая творчая арганізацыя рэспублікі — Гомельскае абласное аддзяленне Саюза мастакоў БССР — па-гаспадарску вырашае надзённыя праблемы. Тут ножны добра разумее, што работа наперадзе — вялікая.

ПАМЯЦІ СЛАЎНЫХ СЫНОЎ

У нядзелю людна было ў гарадскім пасёлку Радашковічы, паблізу якога 25 гадоў назад гераічна загінуў лётчык, капітан М. Ф. Гастэла. З Мінска, Маладзечна, Радашковіч, навакольных саўгасаў і калгасаў сабралася шмат людзей. Ля помніка Героя Савецкага Саюза М. Ф. Гастэлы адбыўся мітынг. Яго адкрыў сакратар Маладзечанскага райкома партыі С. Ляшкевіч. На мітынгу выступілі маці члена гастэлаўскага экіпажу П. Бурдзянюк, брат Скарабагатага, аднапалчанін А. Каложын, ваеначальнікі, сябры па лётнай справе, грамадскія і партыйныя дзеячы.

□ □ □

У гэты ж дзень мітынг і ўскладанне кветак і вянкоў адбыліся ля помніка Янкі Купалы.

Госці з розных гарадоў краіны і рэспублікі накіраваліся ў Вязынку — на радзіму народнага паэта.

Ля помніка Я. Купалы і ў Вязынцы выступалі пляменніца Я. Купалы, галоўны захавальнік музея Я. Раманоўская, з успамінамі выступіў паэт С. Шушкевіч. Украінскі паэт П. Гарэцкі прачытаў верш, прысвечаны Янку Купалу.

У заключэнне Я. Раманоўская ўручыла гасцям памятныя падарункі — кніжкі Я. Купалы, значкі з партрэтам паэта, музейныя выданні — зборнікі, буклеты, даведнікі.

БЕЛАРУСЬ АРХІТЭКТУРНАЯ

ВЕЖАВЫЯ ШАСНАЦЦАЦІПАВЯРХОВЫЯ

Сёння ў «Мінскпраекце» ствараюць праект вежавага жылога дома на 16 паверхаў. Першыя такія дамы мяркуецца паставіць на «Магілёўскай шашы, на перасячэнні вуліц Якуба Коласа і Волгаградскай і ў некаторых іншых месцах. Яны ўнясуць разнастайнасць у забудову, зробяць кампазіцыйныя акцэнты.

На малюнку вы бачыце вежавыя дамы, прапанаваныя архітэктарам М. Барсуковым. Выкананы яны з буйных панеляў. Стромкі рух угору падкрэслены вертыкальнымі чляненнямі фасадаў.

У кватэрах дома будзе зручная планіроўка — вялікая пярэдняя, кухня, асобныя непрахадныя пакоі, лоджыя. Наверх пасажыраў павязе ліфт, а для грувасткіх рэчаў, мэблі прадугледжваецца грузавы ліфт.

Праектная прапанова архітэктара М. Барсукова ўхвалена калегіяй Дзяржбуда БССР. Будаўніцтва вежавых шаснаццаціпавярховых мяркуецца пачаць у наступным годзе.



Малюнак архітэктара М. БАРСУКОВА.

ПРЫГОЖАЕ — У БЫТ

СУЧАСНАЯ МЭБЛЯ. ЯКАЯ ЯНА?

У нас многа пішуць і гавораць аб прыгажосці жылля, адна за адной арганізоўваюцца выстаўкі мэблі, прапануюцца цікавыя рэчы для сучаснага інтэр'ера. Вялікую работу вядуць і беларускія мастакі-канструктары. Іх мэбля, якая дэманстравалася на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР, атрымала высокую ацэнку. Многія яе ўзоры будуць асвоены прамысловасцю і з'явяцца ў магазінах ужо ў наступным годзе.

Беларускія мэбельшчыкі паказалі на ВДНГ СССР восем гарнітураў для адна-, дзвюх- і трохпакаёвых кватэр, два наборы для спальных пакояў, адзін—для дзіцячага, тры наборы мэблі для прыхожых і дваццаць сем асобных узораў. Асартымент даволі значны.

Спачатку некалькі слоў пра секцыйную мэблю, якая ў апошні час пачала шырока распаўсюджвацца і ў нас, і за рубяжом. Перавага яе ў тым, што яна дае дадатковыя выгоды ў параўнанні са звычайнай, робіць жыллё больш утульным і зручным.

У наш быт сёння трывала ўвайшлі тэлевізар, магнітафон, радыё, многія сем'і маюць бібліятэкі. Задача праекціроўшчыкаў—улічваць усе дробязі быту, прадугледзець для кожнай рэчы сваё месца. Зручная і тая мэбля, якая дазваляе за кароткі час змяніць усё ўнутранае аблічча жылля адпаведна густу гаспадара. Улічваючы гэта, мастак Л. Піхоцкі прапанаваў своеасаблівы набор мэблі для кватэры з аднаго пакоя. Кампазіцыйным цэнтрам набору з'яўляюцца ўстаноўленыя побач камбінаваныя шафы для кніг, пасуды і сталовай бялізны. Шафы па вышыні складаюцца з трох секцый. Секцыі верхняй зоны часткова маюць глухія дверцы, часткова зачыняюцца перасоўнымі шыбамі. Усю шырыню сярэдняй секцыі займае сакрэтнік, даволі багаты сваім унутраным абсталяваннем. Ніжнія секцыі зачынены глухімі дверцамі і ўтвараюць даволі ўстойлівы кампазіцыйны пояс, які злучае ўсю групу. Ручак у наборы няма, але адчыняць і зачыняць дверцы лёгка і зручна. А вонкавы выгляд гарнітура ад гэтага выйграў. Архітэктура набору стала страйнейшая і па-хатняму ўтульная. Шафы выгадна вылучаюцца сярод набораў мэблі, паказаных на выстаўцы іншымі арганізацыямі, дзе прыкметна кідаецца ў вочы дрэнная фурнітура.

У агульным пакоі сучаснай кватэры, як правіла, прадугледжваецца спальнае месца, нават калі сям'я мае спальню. Няма ніякага сэнсу займаць месца канапаю, бо канапа-ложак выконвае функцыі і канапы, і ложка. Характэрна, што на пытанне: «Якую рэч вы ахвотней набылі б—канапу ці канапу-ложак?»—дзевяноста чатыры са ста чалавек адказалі, што ім больш падабаецца канапа-ложак. Прычым, пакупнікоў не бянтэжыць, што ён трошкі даражэйшы. Гэта кампенсуецца зручнасцямі, якія ён дае ў малагабарытнай кватэры. Па выдумцы і канструкцыйных асаблівасцях канапа-ложак Л. Піхоцкага з'яўляецца унікальным. Ператварэнне канапы ў ложак робіцца па даўжыні за кошт тумбы, у якой на дзень хаваюць пасцель. Днём тумба служыць столікам, займаючы амаль чацвёртую частку даўжыні канапы. Як правіла, мэбля, якая трансфармуецца, выглядае грувасткай, канструктыўна недасканалай. Канапа-ложак Л. Піхоцкага прыгожы ў любым выглядзе і лёгка ўпісваецца ў сучасны інтэр'ер.

Даволі дасціпна вырашаны Л. Піхоцкім крэслы ў наборы. Два крэслы могуць быць пастаўлены побач і ператвораны ў канапу або раскладзены ў ложак.

Іншыя рэчы з гэтага набору таксама добра прадуманы. Кожная—частка цэлага і ў той жа час можа быць упісана ў іншы інтэр'ер. Гэта вялікая заслуга аўтара. Набор атрымаў самыя высокія ўзнагароды: Дыплом першай ступені, залаты і два бронзавыя медалі ВДНГ СССР.

Сярод пытанняў, якія задавалі наведвальнікам выстаўкі, было і такое: «Ці падабаецца вам мэбля, якая лёгка перастаўляецца?» Працэнт станоўчых адказаў высокі—семдзесят і дзве дзесятыя. Можна меркаваць, што гэтыя сем чалавек з дзесяці—пакупнікі секцыйнай, універсальна-разборнай і стэлажнай мэблі.

Эксперыментальная работа апошніх гадоў у галіне стэлажнай мэблі вялася многімі праектнымі арганізацыямі, але прамысловасць і сёння яе не выробляе. Аматарам кніг вядома, як цяжка набыць добрыя кніжныя шафы, секцыі, стэлажы. І беларускім мэблевым фабрыкам, відаць, трэба сур'ёзна зацікавіцца гэтай мэбляю. Мастакі-канструктары прапанавалі цікавыя ўзоры.

В. Мягкоў і Э. Саланка стварылі арыгінальныя стэлажы. Пакупнік набывае ў магазіне асобныя секцыі і дэталі. Зборка іх простая. Наведвальнікі выстаўкі падоўгу затрымліваліся каля стэлажоў беларускіх мастакоў. І, мяркуючы па водгуках, ім удалося задаволіць патрабаванні будучых пакупнікоў.

Асаблівай увагі заслугоўваюць работы архітэктара Э. Шуберта, які распрацаваў наборы мэблі для спальні і дзіцячага пакоя.

У яго наборах, як і ў работах іншых мэбельшчыкаў Беларусі, заўважаецца арыгінальны падыход да праектавання. У мэблі спальнага пакоя дасціпна выкарыстана прастора пад ложкам, дзе можна хаваць пасцель. У шафе для адзення і бялізны таксама выкарыстаны аб'ём ля падлогі для хавання абутку. Адзін з варыянтаў шафы мае дадатковыя паліцы ў выглядзе антрэсоляў па ўсім унутраным перыметры. Шафа ўдала абсталявана. Гэта адзін з рэдкіх прыкладаў таго, калі аўтар добра вырашыў не толькі архітэктуру вонкавага выгляду і максімальна выкарыстаў унутраную прастору, але і прадумаў усе дробязі абсталявання. Тут рацыянальна выкарыстана нават месца на ўнутраным баку дверцаў адзежнай шафы для хавання капелюшоў, гальштукаў і іншых рэчаў.

А вось другі набор Э. Шуберта—для дзіцячага пакоя. У прамысловасці і па сённяшні дзень на гэтую мэблю амаль не звяртаюць увагі. Між тым, аўтар простымі, гранічна скупымі сродкамі стварыў вельмі ўтульны куток для малышоў. У наборы шэсць вырабаў, у тым ліку падвясная палічка. Дзякуючы дасціпнаму вырашэнню спальнага месца, якое прыбіраецца на дзень і займае ў тры разы менш месца, чым звычайны ложак, увесь набор невялікі, зручны. Гэта вызваляе на дзень значную частку пакоя для дзіцячых гульняў. Мастак знайшоў прыгажосць у простых формах. Ясень, якім аздоблены шчыты, дэкаратыўна прыгожы. Празрысты шаўкова-матавы лак добра раскрывае прыгажосць драўніны. Натуральнае дрэва вельмі добра спалучаецца з мяккай і прыемнай па колеру афарбоўкай ножак стала і табурэткі.

Вядома, што выгляд мэблі ў многім залежыць ад якасці выканання, аздаблення і колеру. Якраз добрай работай радуе дзіцячая мэбля Э. Шуберта, зробленая Рагачоўскай фабрыкай. Думаецца, што праекціроўшчыкі на базе гэтага набору змогуць стварыць яшчэ больш зручную мэблю для дзяцей. На мой погляд, для стала і табурэткі трэба прадугледзець магчымасць «росту» ў сувязі з ростам дзяцей. Такія ўзоры ўжо сустракаюцца ў праектах Усесаюзнага інстытута мэблі і іншых праектных арганізацый, яны атрымалі высокую ацэнку. Дарэчы, наведвальнікі выстаўкі выказваліся і за двух'ярусныя дзіцячыя ложкі, што таксама трэба ўлічыць Э. Шуберту. Мадэлі гэтага віду мэблі экспануюцца на выстаўках і кожны раз збіраюць вялікую колькасць прыхільнікаў.

Заслугоўвае ўвагі і набор для двухпакаёвай кватэры, створаны беларускім мастаком Ю. Зайцавым. Кожную рэч з гэтага набору можна прадаваць і асобна. Тут разумна зроблены розныя прыстасаванні для навескі і мацавання рэчаў. Увогуле характэрна для мастакоў Беларусі, што яны сур'ёзна клапоцяцца пра ўнутранае абсталяванне мэблі. У наборы Ю. Зайцава прыцягвае ўвагу мяккая мэбля, крэслы і канапа-ложак. Чаргаванне прамалінейных форм з круглымі скошанымі ўніз ножкамі ў спалучэнні з гладкімі, прыемнымі па структуры і колеру тканінамі Брэсцкай суконнай фабрыкі дае добры эфект.

Мне памятаецца размова з літоўскімі мастакамі пра беларускую мэблю на выстаўцы. Уважліва ўсё прагледзеўшы і ўзважыўшы, яны заявілі: «Беларусы нас абскакалі». Выстаўка пераканаўча паказала, што беларускія мастакі здольны стварыць мэблю, якая не ўступае лепшым зарубежным узорам.

С. ДЗЯБУРА,
мастак.

Невядома, звяжа ці не звяжа вучаніца 43-й школы г. Мінска Наташа Свістунова свой лёс з балетам. Гэта пакажа час. А пакуль што дзяўчынка ахвотна займаецца ў балетнай студыі Палаца культуры Мінскага трактарнага завода.

Фота С. АНАНКІ.

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

СА СКАРБАЎ ЭРМІТАЖА

Семдзесят пяць жывапісных палотнаў і дваццаць чатыры графічныя лісты складаюць экспазіцыю гэтай перасоўнай выстаўкі твораў са скарбаў Эрмітажа, якая вось ужо дванаццаць год падарожнічае па краіне і цяпер завітала ў Мінск. Адкрыццё выстаўкі адбылося 24 чэрвеня ў Дзяржаўным мастацкім музеі БССР.

Мэта выстаўкі — паказаць станаўленне і развіццё рэалізму ў мастацтве Фландрыі і Галандыі XVII стагоддзя. Гэта адзін з важных перыядаў у гісторыі еўрапейскага мастацтва. Нідэрланды, распачаўшы яшчэ ў XVI стагоддзі барацьбу супраць іспанскага прыгнёту, хоць і не цалкам вызваліліся ад палітычнай залежнасці, былі наперадзе многіх еўрапейскіх краін — асабліва ў галіне стварэння самабытнай нацыянальнай культуры і мастацтва. Гэты рух быў аднолькава моцны і на поўначы краіны, дзе ў выніку рэвалюцыі 1566 года ўтварылася буржуазная рэспубліка Галандыя, і на поўдні—у Фландрыі, якая заставалася пад уладай Іспаніі.

Невялікі ўводны раздзел выстаўкі знаёміць з напрамкамі нідэрландскага жывапісу перадрэвалюцыйнага перыяду.

Наступны раздзел выстаўкі прысвечаны мастацтву Фландрыі XVII стагоддзя, калі ў плеядзе цудоўных жывапісцаў краіны першае месца па праву займаў Пітэр Пауль Рубенс (1577—1640).

У карціне «Малыя Хрыстос і Іван Хрысціцель», выкананай у майстэрні Рубенса, у цэнтры—двое дзяцей, фігуры якіх выдзяляюцца светлаю плямаю на фоне цёмнага пейзажу. Рухі і позы малых, якія лашчаць ягня, простыя і непасрэдныя. Стварэнне ўражання жывой сцэны з жыцця дзяцей. На выстаўцы бачым таксама партрэт Генрыха IV—крыху зменены паўтарэнне вобразу французскага караля з адной з вялікіх алегарычных кампазіцый, выкананых Рубенсам у 1621—1625 гадах для Люксембургскага палаца ў Парыжы.

Адлюстраванне быту займае вядучае месца ў мастацтве Якаба Іярданса (1593—1678). Гравюра Больсверта з карціны Іярданса «Як спяваюць старыя, так пішчаць маладыя» дае ўяўленне пра яго жанравы жывапіс. Работа з майстэрні Іярданса «Святое сямейства» сведчыць, што мастак надае сапраўды рэалістычны характар і сваім рэлігійным кампазіцыям.

Паралельна з яркім, манументальным напрамкам мастацтва Рубенса і яго школы ў Фландрыі існаваў і іншы напрамак—больш камернага характару, што збліжала яго з мастацтвам Галандыі. Мастакі гэтай групы пісалі невялікія па памерах, стрыманыя па колеру карціны пераважна жанравага зместу, такія, як «Сялянскі танец» (Тэнірс), «Сяляне за ядой» (Гіліс ван Цільборх).

Найбольш поўна паказана на выстаўцы галандскае мастацтва XVII стагоддзя, для якога характэрна надзвычайная разнастайнасць тэматыкі. Чалавек і яго штодзённае жыццё, родная прырода, хатняя жывёла, рэчы побыту— усё аднолькава цікавіць мастакоў і стала тэмай для карцін. У гэтым раздзеле выстаўкі і партрэты Міравельта, Кейзера, Вліта, створаныя ў першай палове XVII стагоддзя, і ўзоры больш позняга часу—работы славутага Рэмбранта ван Рэйна (1606—1669) і яго школы. Асабліва цікавае старадаўняе паўтарэнне славутага групавога партрэта Рэмбранта, што ўмоўна называецца «Начны дазор». Яркая, сапраўды дэмакратычная творчасць Рэмбранта аказала вялікі ўплыў на многіх мастакоў яго часу. Мы можам пераканацца ў гэтым, пазнаёміўшыся на выстаўцы з работамі яго вучняў Плема і Боля, а таксама з дзвюма карцінамі невядомых майстроў яго кола.

Галандскі бытавы жывапіс паказаны сцэнамі з жыцця ваенных, бюргераў, гарадской беднаты, сялян. Такія — «Вандроўны лекар» Фінторса, «Шавец» Брекеленкама, «Дзіцячае вяселле» Маленара і іншыя.

Славуты галандскі нацюрморт прадстаўлены палотнамі Кальфа, Рынга, Бейерэна.

Пейзаж, які быў у XV стагоддзі толькі фонам для карцін рэлігійнага зместу, у наступным стагоддзі ў Нідэрландах становіцца самастойнай галіной жывапісу. Але толькі ў мастацтве Галандыі XVII стагоддзя пейзаж становіцца вядучым. У пошуках рэалістычнай перадачы рэчаіснасці галандцы пішуць летнюю спёку, зімовую сцюжу, начны змрок і яркае сонечнае асвятленне, бязмежныя марскія прасторы і глухія лясы («Рачны пейзаж» Схуфа, «Пажар» Пуля, «Начны пейзаж» Нера, «Зіма» Беерстратана, «Марскі пейзаж» Сіло і іншыя).

У другой палавіне XVII стагоддзя галандская буржуазія паступова становіцца паразітычным класам. І ў мастацтве адпаведна слабнуць рэалістычныя тэндэнцыі. Характэрная ў гэтым плане карціна Квінгхардэна «Дзяўчына з папугаем», дзе асабліва прыкметна імкненне да ідэалізацыі і знешняй эфектнасці, хоць і захоўваецца вялікае жывапіснае майстэрства.

Цікавыя сустрэчы з вялікімі творамі вялікіх майстроў чакаюць кожнага, хто наведае гэтую выстаўку.

Н. СМОЛЬСКАЯ.

Спектаклі НАШЫХ ГАСЦЕЙ

У ПОШУКАХ СВАЁЙ П'ЕСЫ

СПЕКТАКЛЬ «ВЫКРАСЛЕНЫ З ЖЫЦЦЯ» У РАСТОЎСКІМ ТЭАТРЫ ІМЯ ГОРКАГА

Свая п'еса. Які тэатр не марыў аб ёй. Толькі вось **што такое** свая п'еса, кожны разумее па-свойму. Для адных — гэта п'еса, створаная спецыяльна для гэтага тэатра, п'еса, у якой выказваецца яго творчае крэда, яго аблічча. Для другіх — усё роўна, што дае п'еса тэатру і гледачу, галоўнае, каб яна не ішла больш ні ў каго. І пад гэтым дэвізам прымаюцца да пастаноўкі зусім слабыя рэчы, самадзейна інсцэніруюцца эпапеі, аповесці, дэтэктывы.

У рэпертуары Растоўскага тэатра імя Горкага, прывезеным у Мінск, дзве «свае» п'есы, свае ў тым сэнсе, што інсцэніроўкі напісаны акцёрамі гэтага тэатра, аўтары паставілі іх і самі ў іх іграюць. Але калі спектакль «Цыган» па праву прапісаны ў нашых гасцей (аповесць А. Калініна «Цыган» апісвае падзеі, якія адбыліся на Доне, і каму, як не растаўчанам, іграць яе), дык пра «Выкрасленага з жыцця» гэтага не скажаш.

Падзеі адбываюцца ў Англіі (В. Шатуноўскі. Інсцэніроўка рамана А. Кроніна). Перад гледачом —расказ пра судовы працэс, на якім быў асуджаны невінаваты, у той час як сапраўдны забойца застаўся ў ценю. Але сапраўдны злачынца — першы багацей у горадзе, таму яго імя нават не ўпаміналася ў справе, а да пажыццёвай катаргі прыгавораны чалавек, які апынуўся пад рукою. На гэтым пракурор зрабіў кар'еру. Цяпер ён выставіў сваю кандыдатуру на выбары і сёння яму асабліва не хочацца, каб гісторыя пятнаццацігадовай даўнасці зноў успляла на паверхню. А небяспека такая існуе, бо дарослы сын асуджанага, які даведаўся пра існаванне бацькі, дарэмна спрабуе сустрэцца з ім, пераконваецца ў яго невінаватасці і патрабуе перагляду старой справы. Нягледзячы на ўсе перашкоды, ён гэтага дамагаецца... Такі кораткa сюжэт п'есы.

Што ж гаворыць яна гледачу? Што ў Англіі заблытанае і недасканалае судавядзенне, якое абапіраецца на формулы і законы спрадвечнай даўнасці? Але мы ведаем пра гэта з часоў «халоднага дома» Чарльза Дзікенса... Або можа гэта гісторыя пра тое, як дзеля кар'еры абвінаваўцы загубіў абвінавачваемага? Але гэта ўжо было ў «Амерыканскай трагедыі» Тэадора Драйзера...

Урэшце рэшт усё на свеце паўтараецца, запярэчыце вы, важны новы ракурс пытання, іншыя характары, іншыя адценні падзей, і наогул гісторыя чалавечай душы, трагедыя бацькі і сына заўсёды будзе прыцягваць увагу. Але ці атрымалася трагедыя бацькі і сына? Для таго, каб нас кранула іх гісторыя, для таго, каб мы разам з імі перажывалі іх пакуты, нам трэба было палюбіць іх, убачыць іх у дзеянні, пазнаць іх характары. Ці быў дадзены нам такі матэрыял?

Вось сын—Поль Мэфры (артыст Э. Дземчанка). Ён мілавідны. Іграе на раялі. Упарта ідзе да сваёй мэты. Гэта, бадай, і ўсё, што мы можам пра яго сказаць. А Поль жа — галоўная дзеючая асоба. Ён пачынае і канчае спектакль. Ён праходзіць праз усе сцэны. Але матэрыял п'есы пабудаваны так, што Поль — не дзейнічае. Ён толькі выслухоўвае расказы пра бацьку (сцэны з маці, з Прасці, Суонам, Луізаю Берт) або сам расказвае пра яго Берлі, Лене і г. д... І нават калі ён прыкоўвае сябе ланцугом да агароджы помніка з плакатам «Нявінны—асуджаны» — мы не бачым яго пратэсту. Пра гэта зноў-такі расказваюць у паліцэйскім участку. Выканаўца ролі Поля пастаўлены аўтарам інсцэніроўкі ў цяжкае становішча, і нельга сказаць, што ён выйшаў з яго з гонарам.

Ёсць у Поля адна сцэна, пра якую хочацца сказаць асобна. Гэта ўнутраны маналог пасля таго, як ён даведаўся, што бацька яго жывы, што ён — забойца і адбывае катаргу ў Каменным стэпе. Да гэтага юнак лічыў, што бацька памёр — маці ўстаіла ад сына праўду і нават прозвішча яму змяніла (дала сваё дзявочае).

Поль рашае, як яму жыць далей. І колькі крыку, колькі ілжывага пафасу ў гэтай размове з самім сабою.

Міжволі прыходзіць на памяць амаль такая ж сцэна са спектакля купалаўцаў «Выклік багам». Таксама на авансцэне, твар у твар з гледачом сядзела Інга — артыстка Г. Талкачова і вырашала, як жыць далей, калі жыццё засталося ўсяго год-два. Ні кроплі вонкавай патэтыкі, бо ўнутраны голас не размахвае рукамі. У самых трагічных месцах, калі спазма душыла горла, яна шаптала, але шэпт гэты быў чуваць і на апошнім радзе балкона — так замерла зала.

Кажуць, справа ў тым, што ў нашых гасцей «дома» вялікая зала з дрэннай акустыкаю, там даводзіцца напружваць голас, а ў новых умовах перабудаваецца можа далёка не кожны. Але гледачу няма справы да тэхнічных прычын. Увогуле з Полем яму яўна не пашанцавала. Не паспеў ён палюбіць і бацьку Поля — Рыза Мэмры (заслужаны артыст РСФСР В. Волкаў).

З турмы Рыз выходзіць зусім пакалечаны, паўжывёліяю. Іншым мы яго не бачылі, не ведалі. Адной фразы інспектара Суона (артыст В. Смятаннікаў) аб тым, што ён не быў падобны на злачынца — мала, каб пранікнуцца да гэтага чалавека не толькі сімпатыяй, а нават проста спачуваннем.

Нічога толкам не даведаліся мы і пра маці Поля (артыстка П. Пятрова). Бацька называе яе ханжой, мы не ведаем, ці верыць яму, мы з ёю сутыкнуліся толькі раз.

Ну, а астатнія дзеючыя асобы? Іх у спектаклі вельмі многа, куды больш, чым характараў, і яны з'яўляюцца толькі дзеля таго, каб расказаць пра бацьку, даць чарговае звяно ў ланцужок. Так, Альбер Прасці (заслужаны артыст РСФСР П. Лабада) гаворыць, што справу вёў інспектар Суон. Той расказвае пра падазроную сведку Луізу Берт. Луіза (заслужаная артыстка РСФСР Е. Кузняцова) выхваляецца сваім лжэсведчаннем і г. д. Яны толькі носьбіты чарговага звяна ланцужка падзей, а жывыя людзі толькі ў той ступені, у якой ім змаглі даць плоць акцёры, якія ідуць ад сваіх унутраных запасаў, а не ад матэрыялу п'есы. І калі вопытныя акцёры Г. Гуроўскі (Мэцью Спрот), заслужаны артыст РСФСР А. Мальчанка (рэпарцёр Дан), заслужаны артыст РСФСР В. Шатуноўскі (адвакат Грэхэм) удыхнулі ў сваіх герояў жывую душу, дык большасць акцёраў зрабіць гэтага не змаглі. З моладзі толькі С. Краснюк здолеў надзяліць свайго Марка Булію рысамі, якія нам штосьці гавораць.

І ўсё гэта адбылося таму, што, імкнучыся захаваць у інсцэніроўцы ўсё ад рамана, аўтар перагрузіў п'есу дзеючымі асобамі, пакінуў пабочныя і непатрэбныя лініі. Такая гісторыя Лены. Лена Андэрсан (арт. С. Зайцава) — бялявая любоў і анёл-ахоўнік Поля. І хіба перастала б яна любіць Поля або памагаць яму, калі б у самой у яе не было цяжкой душэўнай траўмы? Не думаю, што гэтая акалічнасць зрабіла б уплыў на іх адносіны. Але ўсё ж Дан у паспешлівасці, пад самую заслону, расказвае Полю пра трагедыю, якую перажыла Лена.

Вышэй гаварылася, што кожная з дзеючых асоб дае чарговы штуршок, і клубок падзей разматваецца... Але ёсць адзін персанаж, усю лінію якога можна зняць зусім бяскшодна. Гэта Чарльз Кэзлз, былы катаржнік (заслужаны артыст РСФСР І. Швейцар). Кэзлз хоча палічыцца са Спротам і ўгаворвае Поля забіць абвінаваўцу яго бацькі. Юнак згадзіўся, але потым нічога не змог зрабіць. У ходзе падзей нічога не змянілася, а з'явіліся толькі дзве лішнія сцэны. Да таго ж другая занадта меладраматычная. Поль зусім ужо быў падрыхтаваўся стрэліць у Спрота, але тут увайшоў маленькі сын пракурора і зайграў эцюд Шапэна, той самы, які так любіў Поль, і пад гукі гэтай музыкі рука Поля не здолела ўзняць пісталет. Ах!

І вось з-за такіх сцэн усім астатнім давялося пацясніцца, а дзеючым асобам мільгаць як у калейдаскопе, размаўляць скорагаворкай.

М. ГАРЭЦКАЯ.

З нашай пошты

ПАМАГЧЫ ЭНТУЗІЯСТУ

Мінск, Каліноўскага, 1, кватэра 48... На гэты адрас паштальёны вельмі часта прыносяць пісьмы, бандэролі. Ідуць яны з розных куткоў Савецкага Саюза — з райкомаў, абкомаў партыі, абласных і рэспубліканскіх архіваў, ад прыватных асоб, з Польшчы, Чэхаславакіі. У іх — фотаздымкі, копіі дакументаў, фотаплёнкі, проста цёплыя словы, парады, пажаданні поспеху ў нялёгкай справе. А гаспадар кватэры З. М. Маслаў узяўся за сапраўды нялёгкую справу. Зміцер Максімавіч наважыўся стварыць музей Кастуся Каліноўскага. Больш года ўжо ён збірае матэрыялы пра жыццё і дзейнасць слаўнага сына беларускага народа.

У кватэры Маслава беражліва захоўваюцца партрэты «Яські — гаспадара з-пад Вільні», партрэты яго саратніка В. Урублеўскага — легендарнага генерала Парыжскай камуны, выхадца з мястэчка Жалудок былога Лідскага павета, фотаздымкі універсітэцкіх будынкаў у Вільні, дзе быў арыштаваны «Вітажэнц» — Каліноўскі, фотакопіі нумароў «Мужыцкай праўды»... Каля сарака фотаэкспанатаў, якія характарызуюць К. Каліноўскага ў перыяд яго жыцця і вучобы ў Пецярбургу, даслаў Ленінградскі гістарычны архіў. Сярод іх — прашэнне, напісанае рукой Каліноўскага, аб назначэнні яму стыпендыі, прашэнне аб допуску яго да ўступных экзаменаў.

Экспанаты, экспанаты... Пра ўсе немагчыма напісаць у кароткай нататцы, бо ўжо цяпер іх набіраецца некалькі соцень, і з кожным днём колькасць іх павялічваецца. І ўсё больш робіцца відавочна, што Зміцеру Максімавічу патрэбна дапамога. Сабраным экспанатам цесна ў яго невялічкім пакойчыку. З-за цеснаты ён вымушаны адмовіцца ад некаторых экспанатаў (скульптурныя партрэты, палотны). А для музея яны вунь як патрэбны!

Магчыма, гаворку пра асобнае памяшканне для музея пачынаць ранавата, але пра куток для музея, пра светлы і прасторны пакой для яго ў школе ці палацы культуры гаворку трэба весці, бо музей, які б расказваў пра слаўны і трагічны лёс легендарнага сына беларускага народа, у Мінску патрэбны. Есць звесткі, што ў бліжэйшыя гады на вуліцы Каліноўскага пачнецца будаўніцтва кінатэатра. Чаму б не прадугледзець у праекце спецыяльную залу для музея? А можа і кінатэатр назваць імем Каліноўскага?..

М. ЗЫЛЬ,
інструктар Заводскага райкома ЛКСМБ, г. Мінск.

ПЛАКАТЫ АБ ЗЕМЛЯКАХ

Серыю плакатаў, прысвечаных 50-годдзю Савецкай улады, выпусціў Дзяржынскі райком партыі.

Адкрываецца серыя тэкстам пастановы Пленума ЦВК СССР ад 29 чэрвеня 1932 года аб прысваенні гораду і раёну імя бясстрашнага рыцара рэвалюцыі Ф. Э. Дзяржынскага.

Некалькі плакатаў прысвечана перадавікам прамысловасці, сельскай гаспадаркі раёна. Сярод іх—партрэты шырока вядомых за межамі вобласці Герояў Сацыялістычнай Працы даяркі В. Пі Мыслівец, цялятніцы Я. В. Бандак.

Багатая Дзяржыншчына і землянамі — паэтамі і пісьменнікамі. На плакатах мы бачым знаёмыя нам партрэты Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі, Паўлюка Труса, Ільі Гурскага, Алеся Якімовіча, Алеся Махнача, Артура Вольскага, Івана Калесніка, Алеся Пальчэўскага, Станіслава Шушкевіча, Лідзіі Арабей, літаратуразнаўцы і літаратурнага крытыка Антона Семяноўіча.

М. РОЗУМ,
дырэктар Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна.

ПРЭМ'ЕРЫ НА ГАСТРОЛЯХ

Гастраліруючы ў Магілёве, Гродзенскі абласны драматычны тэатр паставіў два новыя спектаклі. Магіляўчане цёпла сустрэлі прэм'еру «Самая кароткая ночь» па п'есе Р. Назарава. У ёй аўтар апавядае аб працоўных буднях савецкіх вучоных, аб іх гераізме і мужнасці.

Новы спектакль паставіў рэжысёр Н. Алейніч. У галоўных ролях выступаюць артыст П. Філіпаў, заслужаныя артысты БССР Л. Сторажава, А. Панкрат, артысты І. Пратапопава, С. Аляксандраў, В. Тарасаў, Т. Мархель, А. Кітаеў і іншыя.

Жыхары Магілёва з цікавасцю сустрэлі і другі новы спектакль гасцей—камедыю Тадэвуша Кажушніка «Цвыркун ці бюро добрых паслуг». У гэтым драматычным творы паказана жыццё, дружба, каханне польскіх студэнтаў. Спектакль паставілены галоўным рэжысёрам тэатра заслужаным дзеячом мастацтваў РСФСР А. Струніным, афармленне мастака М. Апіекі. У ролях заняты артысты Л. Ашуркава, В. Зайцава, Г. Дзеніскевіч, Е. Батурына, Н. Гаранец, В. Лукаў і В. Бягун.

В. ДЗЁМІН.

НАШЫ МАЙСТРЫ МАСТАЦТВА

АКЦЁР-ЮВЕЛІР

Аркадзь МАЎЗОН

Заслужаны артыст БССР І. МАТУСЕВІЧ

На сцэне маленькі, памяты часам, у памятным адзенні, зарослы бруднай шчацінай чалавек. Сутаргава камечыць у руках шапку. Яму хочацца стаць яшчэ меншым. Хочацца знікнуць, зашыцца ў якую-небудзь дзірачку, каб ніхто ніколі не дазнаўся, што ён яшчэ існуе. Каб пра яго забыліся. Тады ніхто не ўведае, што ён рабіў у час вайны. Але пра яго не забыліся, як і пра тое, што ён рабіў у час вайны. І яму напамінаюць: у час вайны ён прадаўся ворагу. Прадаўся за маркі. Яму хацелася выбіцца ў людзі. Займець сваю фірму. Салон мод. І ён прадаваў ворагу сумленных людзей. Па яго даносах тых сумленных людзей знішчалі, а яму давалі маркі.

І вось цяпер яму трэба трымаць адказ.

Чалавечак сутаргава дрыжыць. Ён гатовы адказаць на ўсе пытанні і — хлусіць. Ён хоча дапамагчы следчаму знайсці ісціну — і зноў хлусіць. Ён ведае пра новыя правілы допыту — цяпер не тыя часы! — патрабуе, каб яго паважалі. Зрэдку ён нават павышае голас, і тут жа, ператварыўшыся ў слімака, у чарвяка, выгінаецца, скавыча, як пабітае сабачанё, але застаецца тым жа — злосна ненавідзіць усё і ўсіх. Застаецца ворагам.

Калі чалавечка пасля допыту выводзяць альбо, скажам інакш, калі ён пакідае сцэну, у зале апладысменты.

Гэта апладзіруюць акцёру, які не на вельмі багатым аўтарскім матэрыяле стварыў яркі, на дзіва закончаны вобраз-характар. Апладзіруюць за майстэрства. І так на кожным спектаклі.

Гэтую маленькую ролю Дымара ў інсцэніроўцы рамана Івана Шамякіна «Сэрца на далоні» іграе заслужаны артыст БССР Іосіф Антонавіч Матусевіч.

Іосіф Антонавіч Матусевіч прыйшоў у Тэатр імя Якуба Коласа, тады яшчэ БДТ-II, амаль сорак год назад. Прыйшоў юнаком. Тут пачаў авалодваць сцэнічным мастацтвам. Тады ў тэатры ўсе былі юныя. Не толькі па гадах. Гэта цяпер выпускнік тэатральнага інстытута ці студыі, які прыходзіць у тэатр, знаходзіць там ужо вопытных майстроў. У той час у тэатры майстроў, у поўным сэнсе слова, яшчэ не было. Былі маладыя таленавітыя акцёры, іх вучылі таленавітыя рэжысёры і была — гэта галоўнае — на дзіва творчая атмасфера, нястомная прага да ведаў, да ўдасканальвання, было шчырае жаданне стварыць новы асяродак беларускай культуры.

У гэтым новым, першым і адзіным для яго тэатры, Іосіф Матусевіч пачаў і пражыў усё сваё творчае жыццё. Няспынна, штодзённа, упарта і настойліва працаваў ён, каб стаць тым, кім па праву лічыцца сёння—майстрам.

Пісаць пра акцёра Матусевіча прыемна і радасна. Ён сыграў багата роляў. Былі ўдачы, былі зрывы. І гэта заканамерна. Мастацтва — не шаша, пакрытая асфальтам. Я хачу ўспомніць удачы. Іх было больш.

...Бясшумна перасоўваецца на крывых, сагнутых ад старасці ножках, у бясколерным, ужо выцвілым ад часу мундзірчыку кур'ер Чыр. Калісьці Чыр служыў у нейкай губернскай канцылярыі. Цяпер, пасля рэвалюцыі, служыць у губкоме Саветам. Знешне — ён сама адданасць новым уладам. Унутрана ён — страшэнная разнавіднасць ліслівага раба і хамелеона — гэтую новую ўладу ненавідзіць і гатовы ёй здрадзіць у любую хвіліну, што і робіць, як толькі надараецца такая магчымасць. Чыр увесь час з богам на вуснах. У яго ціхенькі, ласкавенькі галасочак, поўныя сабачай гатоўнасці вочкі...

Такім трыццаць гадоў назад іграў ролю Чыра ў п'есе К. Транёва «Любоў Яравая» на сцэне Тэатра імя Якуба Коласа Іосіф Матусевіч. Роля ў параўнанні з іншымі ў п'есе — маленькая. Я глядзеў спектакль «Любоў Яравая» і на іншых сцэнах, і ў іншых тэатрах, а запомніў у гэтай ролі Іосіфа Матусевіча. Настолькі яркім, поўным, шматгранным, з дзівосна дакладнай псіхалагічнай распрацоўкай быў вобраз, створаны акцёрам.

Праз многа год пасля ролі Чыра Іосіф Матусевіч з такой жа глыбінёй раскрывае і дзве ролі ў п'есах Максіма Горкага: канторшчыка Палогага («Ворагі») і гаспадара начлежкі Кастылёва («На дне»). Няма патрэбы гаварыць, які цудоўны драматургічны матэрыял атрымаў акцёр. Але матэрыял, які б ён сам па сабе ні быў цудоўны, яшчэ павінен быць ажыўлены ў новай якасці, у якасці сцэнічнага вобраза. І акцёр гэтага дамогся. Створаныя Іосіфам Матусевічам вобразы Палогага і Кастылёва былі горкаўскімі, што ўжо заслугоўвае пахвалы. Яны былі жывымі, жылі кожны па волі свайго характару, мелі кожны свае тыповыя, толькі ім уласцівыя рысы. Таму яны былі пераканаўчымі.

Нельга не ўспомніць і створаны акцёрам вобраз старшыні калгаса Гарошкі ў п'есе Андрэя Макаёнка «Выбачайце, калі ласка». Атрымаўшы і тут добрую літаратурную першааснову, акцёр самастойна ўбачанымі ў жыцці фарбамі, адценнямі ўзбагаціў ролю, зрабіў яе яшчэ больш самабытнай, жывой, словам, стварыў цікавы характар.

Характар—гэта цэлы комплекс чалавечых рысаў, цесна сплеценых у непарыўнай узаемасувязі. Так у жыцці. На сцэне гэта, напэўна, тое самае, але пададзенае праз павелічальнае шкло. Шчаслівы той акцёр, хто мае такое шкло. Тады глядач бачыць на сцэне жывога чалавека, бачыць яго ўнутраны свет, бачыць яго, уласцівую менавіта таму чалавеку, знешнюю форму, што, дарэчы, таксама мае вялікае значэнне для раскрыцця характару. Успомнім—па адзенні сустракаюць. Гаворачы пра Іосіфа Матусевіча, хочацца адзначыць—ён валодае такім шклом. І, напэўна, таму большасць створаных ім сцэнічных вобразаў багатыя і яркія не толькі па сваёй знешняй форме, а і сваім унутраным зместам. Такія—Хлопаў у бессмяротнай і на дзіва сучаснай і зараз камедыі М. Гогаля «Рэвізор», п'яніца-

Пра першую кніжку пісьменніка

ЗНОЙДЗЕНАЕ САМІМ І ЎЗЯТАЕ НАПРАКАТ

Пакаленне, да якога належыць Анатоль Сербантовіч, аўтар кніжкі паэзіі «Азбука», адчувала над сваёй калыскай грозны подых ваеннай навальніцы. І першыя літары, першую сваю азбуку хлапчукі нараджэння 1941 года часта бачылі на маўклівых жалобных плітах і строгіх абеліскаў. А наглядным дапаможнікамі для вывучэння гісторыі былі для іх пакінутыя ворагам плямістыя танкі і абясшкоджаныя сапёрамі міны...

І вось выпускнік вясковай школы едзе вучыцца ў Мінск. Гладкая стужка Магілёўскай шашы, абсаджаная пасляваеннымі бярозкамі. Незамутнёнае сіняе неба, бо даўно ўжо развеялася шызая павалока тратылу і клубы чорнага дыму фашысцкіх крэматорыяў. І ўсё ж ад нейкага дзіцячага ўспаміну ўзрываецца памяць:

Шырокія дарогі і вялікія,
Але яны не толькі у прасцяг...
Вось гэтая пад коламі ускрыквае,
Падкідвае, бы едзем па касцях.
Чаму трасе, калі яна падкована
Асфальтам,—
не тлумачце мне.
Яна і сапраўды касцьмі брукована,
Дарога, што вядзе на Трасцянец.
...Загінулі тут многія і многія,
Здаецца, бачу я, як на двары
Да печаў цягнуць хлопчыка за ногі,
А ён раскінуў рукі-якары.

Вось якая яна, дарога — слова, што пачынаецца з пятай літары азбукі!..

З маральнай меркай чалавека, які ведае, чым брукаваліся нашы дарогі, якой цаной заплацілі мы за ўсё, што маем, падыходзіць аўтар «Азбукі» да многіх з'яў сучаснасці. Грамадзянская актыўнасць яго не можа не радаваць. А. Сербантовіч імкнецца напоўніць сваю лірыку і добрай публіцыстычнасцю, і глыбокім роздумам.

Адзін з лепшых, на маю думку, вершаў кніжкі прысвечаны людзям крыштальнай чысціні, бальшавікам старой гвардыі, «што некалі здароўкаліся з Леніным». Называецца ён «Гімн вечна жывым» і расказвае пра смерць камуніста, строгага і чулага чалавека.

...Пара хаваць.
А я нібы надломлены,
А я,
як фотаплёнка праяўляюся...
О, колькі я свайму знаёмаму
Даказваў тое,
ў чым я памыляюся!
...І я стаю з мяўклівымі
мужчынамі,
І я маўчу,
нібы мяне пакрыўдзілі.

У гэтым шчымлівым, да слёз, маналогу — і сыноўняя павага да старэйшых, і споведзь, і не выказаная ўслых прысяга. І гэтая прысяга вядзе на змаганне за сцвярджэнне ідэалаў, якія адстаялі ленінцы, вядзе на бязлітасны бой супраць усяго, што чужое нам.

Гнеў паэта выклікаюць «няшчырасць мыльная», сытая абмежаванасць, эгаізм, крывадушнасць мяшчан:

Яны ўсміхаюцца нам умеюць,
Хоць іх заўсёды мучыць злосць,
Што на зямлі ім усе пігмеі,
Што на зямлі і людзі ёсць.
(«Пігмеі»)

Душа маладога паэта шырока адкрыта насустрач рамантыцы, насустрач шматзычнасці і шматфарбнасці жыцця. Для яго блізкія і дарагія асабіста і чорная бурка Чапая, і стэпавыя дарогі Цялиннага краю, і кнігі Хемінгуэя. Пра ўсё гэта ён піша шчыра і ўсхвалявана.

Хтосьці казаў, што Дзевятая сімфонія Бетховена нагадвае мармуровыя калоны, якія, адкрываючы ўсё новае і новае, вядуць у нязведаны свет. Сыну шклоўскай вёскі А. Сербантовічу, бліжэй параўнанне з дрэвамі, з павучымі калонападобнымі соснамі, што ўзносяцца над берагам Дняпра.

І гукі расступаюцца, як дрэвы.
О гукі!
Я ваш верны раб.
Яшчэ ў жыцці такога не бывала,
Каб адкрывалася музыку
і каб
Яна мяне таксама адкрывала.

На мой погляд, гэта сказана свежа, па-свойму.

Цікавыя і запамінальныя таксама вершы «Рыбак», «Глыбіня», «Успомню, як ішлі з сявенькамі», «Балада пра ўзараную зямлю» і іншыя.

Трэба сказаць і аб недахопах «Азбукі».

Ёсць у кнізе і пэўная даніна «мадэрнісцкім напевам», і паўтарэнне чужых матываў. Вось вялікі верш (а можа нават маленькая паэма?) «Мая каханая — зіма». Аўтар, відаць, лічыць гэты твор сваім здабыткам, бо вынес яго ў самы пачатак кніжкі. А вось прачытаеш яго — і думаеш: навошта было перапяваць блокаўскую «снежную маску»?

Сняжынкі — белыя агні,
Кусты малочныя, алеі —
І эталонам чысціні
Мая каханая бялее.

Сказана занадта «прыгожа», але і па-зімоваму холадна. У вобразе «каханай» ніяк нельга пазнаць жывую, зямную сучасніцу, яна нагадвае нейкую белую здань. Ну што гаворыць нам такая «характарыстыка»: «Яна харошая ў мяне, яна — і сонца, і марозы. Прамень каханую кране — мая каханая у слёзы». «Мая каханая далёка, мая каханая — як сон». «На поўдзень лета прашумела, як плаце белае яе» (успамінаецца: «Неужели и жизнь отшумела, отшумела, как платье твое»). І, як рэфрэн нейкай безнадзейнасці, нуднае паўтарэнне: «І вось каханае няма, мая каханая — зіма», «І успамінаў больш няма, мая каханая — зіма», «Але яе са мной няма, мая каханая — зіма».

Я свядома больш увагі аддаў гэтаму вершу, каб відаць было, да чаго часам можа прывесці адсутнасць жыццёвага грунту, і што атрымліваецца, калі эталонам паэзіі становіцца прыдуманае, прывіднае, узятае напракат.

Параўнаем зямное, жыццёвае — і ўбачым розніцу:

Відна мне босая пастушка,
Агонь і дзедава ружжо.
...О, як запомніў міг і дзень той!
Дым лез у вочы, як кастра,
Яна развешвала адзенне
Ля вераснёўскага кастра.
Трашчаў ядловец, быццам порах.
А я не знаў, што мне рабіць.
Я не хацеў яе запомніць,
І не магу яе забыць.
(«Маё дзяцінства, нібы птушка»)

Гэта запамінаецца намнога больш, чым мудрагелістае «мая каханая — зіма»...

«Кругаварот» — верш аб прыродзе, аб змене пораў года. Тэма старая, як свет. І шкада, што А. Сербантовіч не ступіў на неруш, а пайшоў па добра пратаптанай сцяжынцы. Рацыяналістычная разважлівасць узяла верх над жывым пачуццём. Зноў — халоднае, «снежнае»:

Зіма!
Ты б не выходзіла на пост,
Цябе б з ахвотай лета падмяніла.
Ну што за радасць:
Снег ляжыць у рост (?),
Усё вакол заснула і застыла.
Сядзі ў пакоі,
Распівай чаі,
На вуліцу не сунься без адвагі.

Уяўнай філасафічнасцю вее і ад абагульняючай думкі: «Я... чакаю цеплыню, але не паддаюся і марозу». Пралік у нечым галоўным пацягнуў з паэтычнай капцёркі і вобразы, так сказаць, «бывшие в употреблении»: «Луг, як лук, з-пад ног страляе качкай»; «Гарбуз у агародзе — шар зямны»...

Заўважаюцца ў зборніку часамі і вяласць думкі, залішняя «умиротворенность» і тое, што лепей пакінуць бы ў запісной кніжцы.

Ты мне верыш. І навошта болей,
Калі любіш ты, як я люблю,
І калі ты знаеш, што ніколі
Я табе благога не зраблю.

Дзіўна, як гэта трапіла ў кніжку...

Але без пралікаў і недаробак, відаць, ні ў кога не абыходзілася ў першым зборніку. Увогуле ж «Азбука» — добрая кніга. У літаратуру ідзе таленавіты, цікавы паэт.

Аляксей ПЫСІН.



Паглядзіце на гэтыя скульптуркі. Паглядзіце ўважліва. Няўжо вам не захочацца іх набыць?.. Праўда, пакуль што яны яшчэ не з'явіліся ў продажы. Але хутка з'явяцца. Аўтар гэтых адмысловых сувеніраў — майстар керамікі Фёдар Зільберт. Наўрад ці трэба казаць — гэтыя работы. Пры першым жа паглядзе ясна, што кераміст паказвае баксёраў, штангіста, футболіста, ганшара.

Тыражыравацца сувеніры будуць майстэрнямі Мастацкага фонду БССР.

НАДРУКАВАНА ў «Полымі»

ДЫХАННЕ ЧАСУ

У чацвёртым і пятым нумарах часопіса «Полымя» за гэты год змешчана новая аповесць Алеся Якімовіча «Канец сервітуту». Апісаныя ў ёй падзеі адбываюцца напярэдадні рэвалюцыі, ахопліваюць самы цяжкі перыяд жыцця беларускага сялянства, калі знясіленыя вайной, абрабаваныя панамі людзі пачалі шукаць новых дарог. Тэма, як бачыце, даволі знаёмая. Здаецца, што яшчэ можна дадаць да ўжо напісанага пра гэты час? Але А. Якімовіч нікога не паўтарыў, здолеў праз светаўспрыманне галоўнага героя — Петруся — дадаць да ўжо вядомага нам шмат свайго, цікавага і запамінальнага.

Малы Пятрусь вядзе нас па сваёй беднай Галынаўцы. Яго цікаўныя добрыя вочы ўсё заўважаюць, ацэньваюць, узважваюць. Яго вачыма мы бачым першую несправядлівасць, якая адбылася на панскім лужку, куды Пятрусь пусціў у шкоду свайго худога каняку, недабітка Дэраша, бачым вайну. Аўтар знаходзіць трапныя выразы, малюе яркія сцэны.

Цікава напісаны раздзел, у якім паказваецца, як у мястэчку, куды паехаў Пятрусь з дзедам, «хабарнікі і драпежнікі» забралі ў іх каня. Пятрусь бачыць, што куды лепшыя коні бракуюцца, бо іх гаспадары могуць «улагодзіць» начальства, а дзедаў і яго Дэраш пайшоў служыць цару. Пра ўсё гэта расказана стрымана і праўдзіва.

Добра, маляўніча пададзены побыт тагачаснага Мінска. Праўдашукальнікі Пятрусь і яго дзед трапляюць у горад, каб паскардзіцца самому губернатару на пана Ясінскага. Але іх нават і блізка не пусцілі да губернатара, і яны яшчэ раз вельмі востра адчуваюць усю абыякавасць царскіх улад да жыцця працоўнага люду.

«Як жыць?» — часта задаюць сабе пытанне героі аповесці. Адказаць на яго нялёгка, асабліва калі нестае ні сілы, ні вопыту. Ды жыццё не стаіць на месцы. Яно вучыць галынаўцаў. Сталее, набіраецца сіл і вопыту і Пятрусь. Вось ён, як самы адукаваны ў вёсцы, становіцца настаўнікам, узвальвае на свае плечы ўжо дарослы клопат і вялікую адказнасць. З'явіліся новыя думы, новыя мары...

Пісьменнік не адрывае жыццё Галынаўкі ад жыцця ўсёй краіны. Подых часу, рост свядомасці народа — усё гэта закранае і Галынаўку, і пра ўсё аўтар апавядае жыва, пераканаўча.

Але не ўсё ў аповесці, як кажуць, гладка і бясспрэчна. Калі ў пачатку падзеі разгортваюцца хутка, дынамічна, то ўжо недзе пад канец яны залішне запавольваюцца. «Настаўнік» раптам становіцца паслухмяным пастушком у багатага засцянкоўца Вінцука. Праўда, акалічнасці для яго склаліся нявесела: надышла галодная вясна, памёр дзед, — але герой як бы «паменшаў». І хоць у канцы аповесці ён зноў «вырасце» — да сакратара сельскага камітэта, — гэта ўспрымаецца, як не зусім верагоднае.

На шчасце, такіх мясцін мала. Аповесць чытаецца, хвалюе. А гэта галоўнае.

Мікола ВАДАНОСАЎ.

Мікола Лобан

БРАТЫ

РАЗДЗЕЛ З РАМАНА

Я толькі што скончыў працу над новым раманам. У цэнтры яго людзі і справы трыццатых гадоў. Чытач ужо меў магчымасць пазнаёміцца з некаторымі героямі рамана па кнізе «На парозе будучыні». Гэта — браты Шэметы, Параска, Сарока... Тут чытач сустрэне іх у зусім іншых абставінах і ў іншым абліччы. Кожны ідзе сваёй жыццёвай дарогай, якая не заўсёды бывае роўнай і гладкай. Прапаную ўвазе чытачоў адзін з раздзелаў гэтага рамана.

АЎТАР.

ПАКУЛЬ на дарозе ляжаў лядок, Шэмет выбраўся ў Некрашы. Каб не крыўдзіць брата, заехаў на яго двор. Двара то ў Мацвея ніякага і не было: два дубовыя слупкі ад былога плоту. З сянец выйшаў Мацвей, без шапкі, у ботах. За ім Марына паказалася.

— Успомніў такі? — сказаў Мацвей, падаючы руку.

— Даўно быў, захацелася паглядзець. Я гляджу — двара няма. — Андрэй паказаў на слупкі.

Мацвей безнадзейна махнуў рукою.

— Не да плоту цяпер. Каторы год палена дроў не даюць. Паехаў бы ў лес пнёў нарэзаць, то без паўлітры каня не выпрасіш. Заходзь, Андрэй, у хату. Пра гэта гамонка яшчэ будзе.

— Усім даюць, табе толькі не даюць, — кальнула Марына.

— Маўчы, я з братам гавару! Так і ўсім даюць, як і мне. Хто паўлітру з кішэні пакажа, таму і даюць. Заходзь, Андрэй, у хату. Даўно ты ў нас быў. Можа і не быў, як сюды перабраліся? На хутары спраўней было. Я смела табе гэта кажу. У нас тут цяпер кажы ды і асцерагайся.

Хата ў Мацвея была, як і ва ўсіх у вёсцы, з дзвюх палавін: сянец, халодных і цёмных, і цёплай хаты.

Андрэй спыніўся каля парога, каб азірнуць хату.

— Можна было б перагарадзіць, каб лепшым часам, — угадваў Андрэеву думку Мацвей. — Нашто ўжо гэтакая абозня?

Дзяцей была поўная хата, ад паджыганцаў да паўзуноў, і ўсе пад адно, у даўжэзных палатняных кашулях, нястрыжаныя, нават цяжка было пазнаць, каторае з іх хлапчук, а каторае — дзяўчынка.

— Яшчэ ж не ўсе, — усміхнуўся Мацвей.

— Колькі ж іх у цябе?

— Сямёра, хай яно гарыць. Восьмым ходзіць. Няма ёй упынку.

— Не лезь да мяне, то не нараджу, — абазвалася Марына.

— Паспрабуй пракармі такую араву.

Убачыўшы незнаёмага чалавека, дзеці папрытульваліся да сцен, печы, ложкаў і, як звяркі, цікаўна пазіралі адтуль. І толькі самае малое не зважала ні на што, поўзала сабе ракам сярод хаты па земляным доле. Марына падбегла да яго, схапіла і пхнула большанькай дзяўчынцы на рукі. Цяпер якраз ім даць па цукерцы ці па кавалачку пячэння. Андрэй аж потам абдаўся — так няёмка яму стала, што забыў пра гэта. Хапіўся за кішэні, за партфель. На шчасце, пра гэта не забыла Ніна. Андрэй вывалак скрутак з пячэннем і цукеркамі-падушачкамі.

— Дзень добры, дзеці! — сказаў ён.

Адказала толькі бальшанькая.

— Чаго ж маўчыце, як ваўкі? Гэта ж дзядзька прыехаў.

— Саромеюцца, — сказала Марына. — Глядзіце, дзеткі, што вам дзядзька прывёз?

Андрэй перадаў ёй загорнутыя ў газету пячэнне з цукеркамі, і тая падзяліла паміж дзецьмі.

— Што трэба сказаць? — крыкнуў Мацвей на дзяцей.

Андрэй пагладзіў па галоўцы самае меншанькае, што сядзела ў дзяўчынкі на руках і пускала пузыры.

— Дзякаваць богу, здаровенькія, самі кідаюцца, — давольна гаварыла Марына.

— Садзіся, Андрэй, я тут на адну хвілінку выйду, — сказаў Мацвей. — На работу сёння то ўжо не пайду. У нас не завуць. Хочаш ідзі, а хочаш не ідзі. Пайду брыгадзіру скажу, што не буду на рабоце. У нас недавольны, калі не скажаш.

Мацвей выйшаў, прайшоў паўз вокны на вуліцу, пастаяў каля варотняга слупка, відаць, раздумваючы, дзе можа цяпер паварочвацца брыгадзір, і накіраваўся на сяло.

— Вот так мы, Андрушачка, і жывём, — пачала Марына, — дзяцей многа, а хлеба няма. Гэту зіму ледзь перазімавалі. Так жа ж было цяжка!

— Мацвей збіраўся ў Мінск на завод. Не паступіў?

— Быў, Андрушачка, і на заводзе. Парабіў з паўгода ды і назад прыехаў. І не абы-як прыехаў, адзеты і абуты прыехаў. Але што, калі на плячах галавы няма. Перад новым годам пайшоў наніўся, то дружкі і абадралі ўсяго. У адных сподніках з вуліцы прыцягла. Вот так уся работа за паўгода і загінула. Ні капейкі ж дадому не прыслаў. Цяжка мне жыць, з ім, Андрушачка, ой, цяжка!

— Ну, а ў калгасе што, не можна жыць? Такі добры калгас...

— Чаму не можна? Можна, Андрушачка, і ў калгасе. Але ж трэба рабіць. У Параскі, хто не робіць, таму нічога не даюць. Ужо што на яе толькі ні прыдумлялі, яна і такая, яна і гэтакая, а яна хоць бы што. То цяпер мужчыны і бабы перад ёю па нітачцы ходзяць. Вельмі ж яе ў раёне паважаюць, што яна гэтакая дзелавая. Няма, кажуць, лепшага старшыні, як яна.

— Дык мо ж Мацвей ходзіць на работу?

— Ходзіць. Але ж каб пракарміць гэтакую сям'ю, то трэба добра хадзіць, не агінацца па вяселлях. Ён жа ў Андролікаву капэлу ўступіў, на нейкай трубе іграе. То сюд-туд і вяселле. Панапіваюцца — сутак двое няма іх. А каб хоць капейка дадому якая. І самой некалі за гэтымі дзяцьмі: пакінь іх, то хату спаляць.

Увайшоў Мацвей.

— Нешта ж ты скора? — сказала Марына.

— У Стафаніхі ўзяў.

— Ведаеш ты, у каго есь.

Мацвей прамаўчаў, выняў з кішэні паўлітроўку і паставіў на стол.

— Не трэба было шукаць, я не любіцель яе.

— Як гэта, каб брат прыехаў ды я без чаркі яго снедаць пасадзіў? Няма ў мяне гэтак. Падавай там, Марына, што ў цябе есь. Можна яе і не любіць, але калі трэба, то трэба.

Андрэй узліў на рукі вады над чыгуном, як некалі дома, калі яны жылі ў пушчы, пацёр калянным ручніком і сеў за стол.

— Што там цяпер на нашым хаціпчы?

— Нічога няма, — махнуў рукою Мацвей. — Сасоннік малады пайшоў. Каб і пасеяў, то гэтакі б не парос. Прырода сваё бяры: высеклі, вынішчылі за войны, а ён адскочыў і расце, густы, як шчотка. Здэцца б, пайшоў і цяпер на бацькавы сцежкі.

Марына паставіла вялікую скавараду яешні з салам і стосік бліноў. Малым на лаве раскідала па адным. Кожнае трымала ў кіпцях драбок чорнага ад подмазкі здору і старанна круціла ім па бліне.

— Можа даўно еў, Андрушык, то ўспамяні, як некалі маці пякла.

Марына ўзяла сваю шклянку з напарсткам гарэлкі ў дне.

— Пра цябе тут часта некрашоўскія людзі гавораць. Вот, кажуць, галава ў каго. Ці ж скора ты прафесарам будзеш?

— Выпі. Марынка, не буду я прафесарам, не ў той бок гляджу.

— Не ў той? Бачыш ты? Яшчэ і лепш бывае, чым прафесар?

— Што ты пра гэта ведаеш? — абсек яе Мацвей. — Прафесар бог ведае што! Ёсць, што мудрэй і прафесара. Закусвай, Андрэй. Бяры скварку, гэта сальца добрае, маладое. У мяне свінні, каб на яго ліха, не вядуцца: падгладзіш крыху, то возьме і прыгазрэе.

— Ну, і што ў цябе з заводам? Пакінуў? — пацікавіўся Андрэй.

— З заводам, Андрэй, выйшла так, што прыйшлося пакінуць. Я паглядзеў, — то гэта таксама не работа: яны — тут, а я — там. На два сталы жывучы, грошай не збярэш. Усё ў пыл ідзе. Падчыстую.

— Ну, ясна. Каб што завялося, Мацвей, то трэба на чым адным спыніцца: або калгас, або завод. А кідацца будзеш то сюды, то туды — то так і ўсё жыццё пражывеш, ад неба адарвешся і зямлі не дастанеш. Усё неяк робіцца да часу ў цябе, быццам кожны дзень некуды збіраешся. Рукі твае тут, а думкі недзе.

— Я і сам гэта, Андрушка, ведаю, а вот пераадолець сябе — не магу. Няма ў мяне твайго характару.

— Галавы няма, а не характару, — уставіла Марына.

— Не мяшай! Дай з братам пагаварыць! Усюды цябе хапае! — Мацвей пажаваў, дзеўбануў яшчэ ў адну скварку відэльцам. — Павучы мяне, Андрэй, як жыць. У цябе неяк усё добра выходзіць. Што ты ні захочаш, то зробіш. А ў мяне гэтага няма. Я загаруся: вось, здацца, усё б зрабіў, а назаўтра вазьму і астыну. Вот што мяне мучыць, Андрэй. Павучы мяне.

— Што ж цябе вучыць? Ты і старэйшы за мяне, і сам сваю хваробу добра ведаеш. Кожны жыве так, як ён хоча.

— Няпраўда гэта, Андрэй, я іначай хачу жыць. А вот не магу! Не магу сябе пераадолець, на свае пастарыцы! — Мацвей стукнуў кулаком па стале. — Што гэта такое, што людзі могуць, а я не магу? А? Скажы ты мне?

— Слаба хочаш. Каб мацней хацеў, то знайшоў бы сілу. Характар чалавеку не бог дае, а ён сам сабе робіць яго. Трэба прымушаць сябе адно зрабіць, а ад другога ўстрымацца. Ты яшчэ малады, яшчэ можна ўсё, што хочаш, з сябе зрабіць. А з гадамі тое, што ўкаранее, калом не выб'еш.

— Дык я ж хачу, Андрэй, ой, як хачу пераміяіцца.

— Смешны ты, Мацвей. Па-рознаму можна хацець. Калі я хачу, то я, не адкладваючы надоўга, пачынаю гэта рабіць. А тваё хаценне і застанецца хаценнем, бо ты не робіш тое, што ты хочаш.

— Вельмі цяпер што захочаш, тое і зробіш? Ты ж як на вяроўцы, прасіся, каб цябе адвязалі. Ты хочаш у Маскву паехаць, а табе якая-небудзь Сарока кажа — тут будзь. І ты мусіш яе паслухаць. Ты хочаш сёння свой агарод узараць, а яна табе скажа — праз тыдзень узарэш. І ты яе мусіш паслухаць, бо ты з голымі рукамі. Вот як, Андрэй. Чалавек цяпер звязаны. А ты кажаш, каб захацеў.

— Ну ясна, не ўсё табе дазволяць рабіць, што ты, другі можаш захацець. Ты не Робінзон на голым востраве, а сярод людзей жывеш, і ты мусіш узгадняць свае дзеянні з людзьмі. Нават першабытны чалавек гэта разумеў. У хоры быць — адну песню спяваць. Наша грамадства абмяжоўвае волю чалавека рабіць тое, што ідзе на шкоду людзям, і дае неабмежаваны прастор для таго, што робіцца на карысць людзям.

— Дык вот то-та ж, усё людзям, а калі ж сабе?

— А раз людзям, то і сабе.

— Калі ж бо гэтыя людзі, на якіх ты робіш, толькі і чакаюць, каб ты нарабіў ды каб прапіць тваю працу.

— Хто чакае, а хто і не чакае.

— Усе чакаюць. Кожны шукае, каб дзе ў каго што ўварваць.

— Няпраўда, не ўсе.

— Калі гэта было, каб у Некрашах па два замкі на дзвярах вешалі? Некалі, я помню, гаспадыня прымкне хату засаўкай, каб шкадлівая свіння не ўлезла, і пайшла сабе на цэлы дзень у поле. А ты прыходзь, пацягні за шнурочак і абяры ўсю хату. Дык гэта ж не было, каб хто абіраў.

— Было, Мацвей, і гэта — абіралі.

— Дык гэта ж у дзесяць гадоў раз. За маю памяць толькі ў Сідаравых палотны былі пакралі ды ў Вярыгаў коней цыганы звялі, то ўсім сялом даганяць ездзілі. А што больш?

— Было і больш, Мацвей, ужо забылася, што было.

— Ну што, што?

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ВЫХОДЗЯЦЬ НА ЭКРАНЫ

«НАРОДНЫ АРТЫСТ»

«Народны артыст Барыс Фёдаравіч Андрэеў. Гэта цудоўна. Бо ён сапраўды народны артыст. Магчыма, самы народны з усіх народных артыстаў... Усе яго ведаюць і ўсе яго любяць. Чаму? Таму што ён шчодры, таму што ён яркі, таму што ён вельмі прыгожы... Ён нават цудоўны, у яго цудоўная душа. І ва ўсіх ролях, якія б ён ні ствараў, акцёрская прывабнасць настолькі вялікая, што ён захапляе гледача і з першай жа мінуты робіцца яго любімцам...», — так гаворыць пра народнага артыста СССР Барыса Андрэева кінарэжысёр Г. Рашаль.

За 30 год артыст зняўся ў дзесятках фільмаў. І кожны з іх — гэта месяцы, а то і гады роздумаў, вялікай працы.

У карціну «Народны артыст» увайшлі фрагменты з фільмаў «Трактарысты», «Вялікае жыццё», «Два байцы», «Аповесць палымяных год», «Паэма аб моры», «Аптымістычная трагедыя» і інш.

Вытворчасць Ніжне-Волжскай студыі кінахронікі. Сцэнарый Д. Тарасава, рэжысёр А. Сяргееў.

«МАСТАК»

Фільм «Мастак» прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння і 70-годдзю творчасці народнага мастака СССР, лаўрэата Ленінскай прэміі, Героя Сацыялістычнай Працы скульптара Сяргея Цімафеевіча Канёнкава. Мастак расказвае пра свае работы, пра сустрэчы з Шаляпіным, Горкім, Паўлавым, Эйнштэйнам і інш.

Вытворчасць Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў і Цэнтральнага тэлебачання. Аўтар сцэнарыя Алена Чарняк, рэжысёры-аператары Юрый Бялянкін, Анатоль Калошын.

«ДУШЫ ЦУДОЎНЫЯ ПАРЫВЫ»

Ужо дзесяць год існуе ў сяле Пархомаўцы Харкаўскай вобласці школьны мастацкі музей, у якім сабрана тры тысячы экспанатаў. Амаль усе карціны, скульптуры — арыгіналы.

Заснавальнік музея — выкладчык гісторыі Апанас Фёдаравіч Лунёў. Яго вучні самі праводзяць экскурсіі, выязджаюць у бліжэйшыя сёлы з лекцыямі аб выяўленчым мастацтве. Сельскі музей падтрымлівае цесныя сувязі з музеямі Масквы і Ленінграда. Многія мастакі — Фаворскі, Неменскі, Канёнкаў і іншыя — падарылі яму свае работы.

Гэты маленькі Эрмітаж робіць вялікую высакародную справу — ён дорыць прыгожае людзям. Фільм «Душы цудоўныя парывы» прысвечаны мастацкаму музею ў сяле Пархомаўцы.

Вытворчасць Украінскай студыі хранікальна-дакументальных фільмаў. Сцэнарый Е. Максімавай, М. Меркель, рэжысёр-аператар І. Альдштэйн.

«АСЕННЯЯ ГАСТРОЛЬ»

Ужо шэсцьдзесят год выступае на арэне цырка Алі-Бек Тузаравіч Кантаміраў. Ён узначальвае групу асецінскіх джыгітаў. Перш чым выйсці на арэну, Алі-Бек быў конюхам, уніфармістам... Цыркам стаў яго домам, домам трох пакаленняў сям'і Кантаміравых.

Шмат гарадоў і краін пабачыў на сваім вяку Алі-Бек Кантаміраў — яму ўжо 85 год. І восьмы гастролі ў родным горадзе. Тут упершыню ён сеў на каня, тут упершыню назвалі яго джыгітам.

Кінастужка «Асенняя гастроль» вытворчасці Паўночна-Каўказскай студыі кінахронікі. Сцэнарый Б. Дабрадзеева, рэжысёр Р. Мярнун.

Некалькі год займаецца разьбой па дрэву Пётр Бусловіч — выкладчык Ашмянскай школы глуханямых. Ім зроблены работы «Герб», «Партызан», «Мара», «Студэнтка», «Свінарка», «Лянда», «П'яніца», «Бюракрат» і іншыя. Некаторыя з гэтых работ самадзейнага разбяра экспанаваліся на Усесаюзнай і Рэспубліканскай выстаўках народнай творчасці.

Войт («Лявоніха» П. Давіпава).

Стары Князь («Іван ды Мар'я» Ул. Гольдфельда).

Сват Фроім («Тэўе Малочнік» Шолам-Алейхема).

сцерка». Я добра ведаю пастаноўку, памятаю прэм'еру. Зараз, тут у Мінску, зноў сустрэўся з тым суддзёй. Знешне ён не змяніўся. Такі ж касцюм, той жа грым. І ўсё ж не той суддзя. Ён і дваццаць пяць год назад быў хітрым і хцівым, фанабэрыстым і распусным. І от жа ж, як расцвілі ўсе гэтыя «якасці» зараз. І радуешся, што вобраз узбагаціўся, стаў яшчэ больш жывым, больш поўным, і радуешся за акцёра, які няспынна, бы ювелір, прадаўжае граніць невялічкі эпізод, надаючы яму новы бляск і яркасць.

У ролі суддзі, у Іосіфа Матусевіча ёсць тэкст. Не вялікі і не вельмі багаты, але тэкст. У адным з апошніх спектакляў коласаўцаў — «Гарачае лета ў Берліне» акцёр іграе фашыста Гюнтэра. Але тут ужо не скажаш — іграе ролю. Ролі няма. Ёсць адзін выхад, без слоў. І, калі ўспамінаецца спектакль, нельга не ўспомніць таго Гюнтэра. Ушчэнт скалечаны фашыст, увесь на пратэзах, ён усё яшчэ жыве. Ён прагне звароту былога, добрага для яго часу, перакананы — той, любы яго сэрцу час вернецца, і Гюнтэр зноў будзе забіваць, паліць, знішчаць. Паўтараю — роля без слоў, Гюнтэр сам і не ходзіць. Яго носяць. І ўсё ж створаны характар. І не толькі знешні. Не. Унутраны, па якім можна пісаць біяграфію.

Крыху вышэй я ўжыў слова ювелір. Іосіф Матусевіч, як акцёр, сапраўды ювелір. Гэта можна заўважыць і па тым, як ён старанна шукае, абдумвае для кожнай новай ролі грым. Як шукае і знаходзіць больш яркую, больш выразную і дакладную дэталь касцюма. Як старанна працуе над словам, над паходкай, над жэстам. Гэта дае свае плённыя вынікі. Акцёр, дакладней створаныя ім вобразы, як правіла, разнастайныя, ніколі не падобныя адзін на аднаго.

Трэба сказаць — Іосіфу Матусевічу і добра пашчасціла ў яго творчым жыцці. Ён меў магчымасць сустракацца ў працы з радам сапраўдных майстроў рэжысуры. Дастаткова ўспомніць такія імёны, як Аляксей Дзікі, Канстанцін Зубаў, Сяргей Разанаў, Іосіф Раеўскі, Мікола Міцкевіч. Гэтыя вялікія мастакі, выдатныя педагогі не маглі не пакінуць добрага ўплыву на творчасць акцёра, і невыпадкова акцёр успамінае іх як сваіх лепшых настаўнікаў словамі вялікай пашаны і павагі.

Для паўнаты партрэта Іосіфа Матусевіча трэба, як мне думаецца, дадаць і тое, што ён камуніст, уступіў у партыю ў часы вайны, што прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці тэатра, заўсёды гатовы прыйсці на дапамогу таварышу, з чым бы той да яго ні звярнуўся.

І апошняе.

Цяпер «модна» гаварыць і пісаць пра хобі таго ці іншага акцёра, мастака. Ёсць хобі і ў Іосіфа Матусевіча. Ён захапляецца паэзіяй. Не толькі многа чытае, але і піша. Праўда, свае вершы ён найчасцей друкуе ў тэатральнай насценнай газеце. Што ж, гэта таксама заслугоўвае пахвалы. Паэтаў у нас і так многа, а вось такой сціпласці... Захапляецца Іосіф Матусевіч і рыбнаю лоўляй. Ён гаворыць, што часамі выбірае даволі многа рыбы. Тут «сціпласць» ужо рыбацкая... І ўсё ж галоўнае захапленне ў Іосіфа Матусевіча — тэатр, якому ён аддаў амаль сорак год з амаль шасцідзесяці, што жыве пад сонцам. Слаўны ён прайшоў шлях, слаўна ідзе па ім далей.

Я з радасцю напісаў пра акцёра, заслужанага артыста БССР Іосіфа Антонавіча Матусевіча і, канчаючы гэтыя нататкі, хочацца сказаць слова некаторым маладым акцёрам, што прагнуць іграць толькі вялікія ролі, грэбуючы маленькімі. Прыгледзьцеся, сябры, як працуе Іосіф Антонавіч Матусевіч, і вы ўспомніце сказанае адным з найвялікшых чараўнікоў тэатра: няма маленькіх роляў...

І тут — усё.

ІГРАЮЦЬ ЛАЎРЭАТЫ

ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ ІМЯ ЧАЙКОЎСКАГА—ГОСЦІ МІНСКА

Стэфан Кейтс

Лоранц Лесар

Масука Усіода

Не будзе вялікім перабольшаннем, калі мы скажам, што музычнае жыццё розных краін свету ў першай палове гэтага года прайшло пад знакам Трэцяга Сусветнага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага. Лепшыя з лепшых маладых скрыпачоў і віяланчэлістаў, піяністаў і спевакоў свету прыкладалі ўсе творчыя намаганні, каб атрымаць ганаровую магчымасць увайсці ў лік удзельнікаў буйнейшага і складанейшага з міжнародных конкурсаў — маскоўскага спаборніцтва музыкантаў. Не менш хваляваліся і іх педагогі, выдатныя прадстаўнікі розных нацыянальных творчых школ і напрамкаў, — бо на маскоўскім конкурсе спаборнічаюць не толькі маладыя таленавітыя выканаўцы, але і сістэмы, методыкі іх выхавання, фарміравання сучаснага мастака. Калі ўлічыць, што для ўдзелу ў рабоце чатырох журы (у адпаведнасці з колькасцю музычных спецыяльнасцей, што ў гэтым годзе прадстаўлены на конкурсе) Аргкамітэт запрасіў у Маскву вялікую групу самых аўтарытэтных музыкантаў сучаснасці і яны ў сувязі з гэтым спынілі на час сваёй адказнай працы ўсю асабістую канцэртную дзейнасць у розных краінах свету, дык і тут мы бачым, якое выключнае значэнне надае грамадскасць конкурсу імя геніяльнага рускага кампазітара. Дадамо яшчэ, што ў Маскву з'ехаліся многія дзесяткі карэспандэнтаў газет, часопісаў, радыёкампаній, каб перадаць вынікі кожнага тура конкурсу і імёны лаўрэатаў ва ўсе куткі нашай планеты; што з розных краін, а не толькі з гарадоў Савецкага Саюза, у Маскву прыехалі аматары паслухаць, як змагаюцца ўдзельнікі конкурсу за выхад у трэці тур. І калі ўсё гэта ўлічыць, дык, відаць, што радкі, якімі пачаліся нататкі пра першае знаёмства ў Мінску з лаўрэатамі конкурсу (адзначым, што Беларуская філармонія, абяцае вялікі цыкл такіх канцэртаў), адпавядаюць сапраўднасці. Так, мы атрымалі магчымасць пазнаёміцца з удзельнікамі падзеі, якая ўсхвалявала ўсё музычнае жыццё гэтага года на ўсіх кантынентах. Скажам адразу: і нельга было не ўсхвалявацца, слухаючы выкананне праграмы канцэрта ў Мінску нашымі гасцямі Масука Усіода, Стэфанам Кейтсам (другая прэмія) і Лоранцам Лесарам (чацвёртая).

Што аб'ядноўвае, акрамя таго, што ўсе яны лаўрэаты Трэцяга конкурсу імя Чайкоўскага і ўсе яны вельмі маладыя, — японскую скрыпачку з амерыканскімі віяланчэлістамі? Нам здаецца — гэта незвычайная адухоўленасць і чысціня іх мастацтва, захапленне магчымасцю іграць такую цудоўную музыку, улюблёнасць у яе. Іменна таму ўсе яны з радасцю вядуць з эстрады палымяную размову са слухачамі.

І ўсё ж яны — і як гэта хораша — зусім розныя. Калі слухаеш Масука Усіода, дык здаецца, што гэта гучыць не яе чароўная скрыпка, а ўся дзяўчынка свяціцца музыкай, якая захапляе сваёй пявучасцю. Таму, відаць, і пакідаюць незабыўнае ўражанне ў яе выкананні «Меланхалічная серэнада» Чайкоўскага, што прагучала на дзіва па-руску; зграбнасць і непасрэднасць «прачытання» яго ж «Вальса-скерца»; гарэзлівасць, мяккі гумар і лірызм чатырох прэлюдый Шастаковіча ў апрацоўцы Д. Цыганова; усхваляванасць Сёмага венгерскага танца Брамса.

Стэфан Кейтс выдатна, усхвалявана выканаў усе творы сваёй праграмы ў мінскім канцэрце. Але лепш за ўсё рысы яго таленту выявіла трактоўка твораў Баха і Бакерыні — кампазітараў XVIII стагоддзя, якіх малады мастак здолеў паказаць нашымі сучаснікамі. Так, выкананне санаты Бакерыні і адажыо Баха ў С. Кейтса не музейная прыгажосць, не даніна павагі да творчасці кампазітараў мінулага. Ён смела і пераканаўча, вельмі па-мастацку адчувае гэтую музыку сам і прымушае нас адчуваць яе як сугучную сённяшнім дням.

Калі першы канцэрт лаўрэатаў у Мінску быў прысвечаны камернай музыцы, дык другі — сімфанічнай. Масука Усіода ў суправаджэнні Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР (дырыжор В. Катаеў) выканала Другі канцэрт Пракоф'ева, а Лоранц Лесар — Канцэрт сі мінор Дворжака.

Як і ў сольным канцэрце, цудоўная японская скрыпачка выявіла ў выкананні твора Пракоф'ева лепшыя рысы сваёй індывідуальнасці: шчырасць выказвання, тэхнічную дасканаласць, тонкае адчуванне прыроды (дадамо — рускай прыроды), музыкі.

Віяланчэльны канцэрт Дворжака — твор выключнай мастацкай сілы не толькі ў чэшскай музыцы, але і ў сусветнай. Гэта па сутнасці сімфонія для віяланчэлі і аркестра, дзе раскрываецца ўсё багацце жыцця з яго цяжкасцямі і выпрабаваннямі, святлом і пошукамі, імкненнямі і здзяйсненнямі. Трэба мець надзвычай тонкае адчуванне рэчаіснасці, вялікі дыяпазон выканаўчых сродкаў і багацце пачуццяў, каб здолець трактаваць канцэрт Дворжака так, як мы чулі ў Л. Лесара. Ёсць усе падставы гаварыць, што малады музыкант валодае цудоўным талентам і сталасцю буйнага мастака, нават калі толькі пачуеш у яго выкананні Канцэрт. Але калі ён на «біс» іграў яшчэ і асобныя часткі з сюіт Баха, і «Марш» Пракоф'ева, — гэтая думка зацвердзілася канчаткова.

У заключэнне некалькі слоў пра тых, без каго не адбыўся б канцэрт лаўрэатаў у Мінску. Нягледзячы на тое, што рояль часам гучаў у яе занадта моцна, наша піяністка Е. Эфрон вельмі ўдала акампаніравала японскай скрыпачцы, асабліва складаную санату Таяма. Натхнёна выконвалі сольныя эпізоды ў канцэрце Дворжака артысты аркестра Г. Клачко (скрыпка), Г. Гедыльтар (флейта), Э. Фарбераў (валторна). Наогул дырыжор В. Катаеў правёў канцэрт Дворжака вельмі тэмпераментна. У канцэрце Пракоф'ева аркестру не хапіла неабходнай мяккасці гучання і разам з тым гнуткасці і яркасці ў правядзенні аркестравых тэм-вобразаў. Гэтыя якасці, на жаль, падмяняла празмерная гучнасць.

М. ІСАКАЎ.

НАВІНЫ КІНО

САЛДАТЫ, ЯКІХ ПРАДАЛІ

На толькі што праведзеным міжнародным кінафестывалі дакументальных і кароткаметражных фільмаў у Кракаве, у якім удзельнічалі карціны 30 краін, Вялікая прэмія «Залаты дракон» прысуджана савецкай стужцы «Апошнія пісьмы».

Вядомы савецкі кампазітар быў, напэўна, здзіўлены, калі два маладыя рэжысёры, два дабютанты, рашуча адхілілі напісаны ім для фільма пра апошнія пісьмы нямецкіх салдат, анружаных пад Сталінградам, жалобны марш. Яго здзіўленне, напэўна, узрасло яшчэ, калі рэжысёры прызналіся, што марш, на іх думку, выдатны, ён проста тані бярэ за душу... і таму яны ніяк не могуць уключыць яго ў свой фільм. І—больш таго— яны вырашылі адмовіцца ад якой бы там ні было спецыяльна напісанай музыкі—у іх карціне толькі фонам пройдуць нацысцкія маршы і песні з фільмаў трэцяга райха, з пласцінак...

Як быццам прыватнасць. Не такі ўжо абавязковы факт з гісторыі фільма. А за ім раскрываецца галоўнае ў задуме дакументальнай стужкі «Апошнія пісьмы».

Пачынаючы балгарскі кінарэжысёр Хары Стойчаў, які прыехаў на стажыроўку ў СССР, і малады савецкі рэжысёр, выхаванец Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі Сава Куліш былі ўдзельнікамі здымачнай групы Міхаіла Рома «Звычайны фашызм». Гледзячы з дня ў дзень на працягу паўтара года кінахроніку трэцяга райха, яны з асаблівай вастрынёй адчулі ўсю двурушнасць фашысцка-мілітарысцкай прапаганды, якая дурманіць галовы жыхароў трэцяга райха з юнацкіх гадоў да канца жыцця, і спрабавалі перадаць гэта ў сваім гісторыка-дакументальным фільме, створаным імі пад мастацкім кіраўніцтвам Міхаіла Рома на кінастудыі «Масфільм».

Я назваў артыкул «Салдаты, якіх прадалі», выкарыстаўшы назву выпушчанай у ГДР у дні дваццацігоддзя Перамогі над фашызмам кнігі бургамістра Дрэздэна Гельмута Вельца, які камандаваў сапёрным батальёнам пад Сталінградам. Кадравы афіцэр, узяты савецкімі войскамі ў палон на Волзе, які стаў актыўным удзельнікам руху «Свабодная Германія», успамінае дзень за днём баі, якія нельга «параўнаць ні з чым» з таго, што давялося перажыць нацысцкаму салдату. Ён шчыра і мужна прызнаецца, як пакутліва і доўга, якім цяжкім шляхам прыходзіў ён да пазнання Праўды!

Не ведаю, ці вядома была аўтарам «Апошніх пісьмаў» гэтая кніга. Магчыма, і не. У СССР яна выйшла ў той час, калі ўжо быў закончаны фільм. Але калі думаеш пра лёс тых, чые апошнія пісьмы са Сталінградскага «катла» ляглі ў аснову стужкі, дык міжволі прыгадваеш назву гэтай кнігі.

Праўда, трэба сказаць, што ў адрозненне ад Вельца рэжысёраў Стойчава і Куліша займаў не адзін толькі лёс салдат шостай арміі, якім здрадзіла камандаванне, загадаўшы ім пад пагрозаю расстрэлу «трымацца да апошняга патрона, да апошняга чалавека».

Чытаючы цяпер, праз дваццаць гадоў, гэтыя апошнія пісьмы людзей, якія пачалі бачыць перад гібеллю, стваральнікі стужкі паставілі перад сабою больш шырокую мэту: паказаць, як на працягу многіх гадоў ашуквалі, абдурвалі нямецкі народ нацысты, як спрабавалі яны ператварыць народ Гётэ, Шылера, Маркса ў народ Гітлера і Герынга.

І таму маладыя рэжысёры пайшлі незвычайным, складаным і для мастакоў і для глядачоў шляхам. Але перш чым перайсці да гаворкі аб творчых прынцыпах фільма, дазволю сабе кароткае адступленне.

Некалькі гадоў назад часопіс «В защиту мира» даў публікацыю «Пісьмы са Сталінграда», якая выклікала вялікую цікавасць чытачоў. Тады ўпершыню прагучаў голас тых нямецкіх салдат, хто дайшоў да Волгі і апынуўся ў гіганцкім «катле», якога яшчэ не ведала гісторыя.

«У студзені са Сталінграда,—паведамляў часопіс, — вылецеў апошні нямецкі самалёт. На борце самалёта ў ліку іншых грузаў было сем мяшкоў з пісьмамі... Пісьмы былі ўскрытыя нацыстамі, размеркаваны па месту, па тону... і адпраўлены ў Галоўную стаўку. Іх хацелі далучыць да агульнай дакументацыі аб гэтай бітве: германскае камандаванне спадзявалася такім чынам апраўдацца. Але калі гэтыя дакументы ўбачыў Гебельс, ён загадаў іх канфіскаваць».

Толькі праз дваццаць гадоў удалося знайсці гэтыя пісьмы. Толькі праз дваццаць гадоў дайшлі яны да людзей, папярэджваючы нащчадкаў, нагадваючы пра трагічную памылку, якая каштавала чалавецтву мільёнаў ахвяр.

Вырашыўшы прачытаць гэтыя пісьмы з экрана, Х. Стойчаў і С. Куліш не паставілі мэты зноў нагадваць гледачу ўзрушальную, але працытаваную ўжо ў дзесятках фільмаў хроніку разгрому фашысцкіх войск пад Сталінградам. Яны не адмовіліся, вядома, ад найбольш нідніх, вобразных кадраў тыпу славутага пехацінца з абвязанай ручнікам фізіяноміяй, у вялізных саламяных галёшах, з коўдраю на плячы і набітым нечым партфелем у руках. Аднак іх хвалявала іншае: шлях усіх гэтых салдат да Волгі—шлях ашуканства, двурушнасці, подласці, якім вялі Германію нацысты, рыхтуючы другую сусветную вайну.

Адсюль стваральнікі фільма і вырашылі «падкладваць» пад тэкст пісьмаў, якія цудоўна чытае за кадрам Міхаіл Ульянаў, не кадры, якія проста пацвярджаюць сказанае, а хроніку мірных год трэцяга райха: парадаў, сямейных абедаў, кірмашоў, хроніку жыцця тылу, дзе тое ж усё, як было ў тыя «мірныя» часы. І ад гэтых асаблівіцый горкі тэкст пісем людзей, якія пачалі бачыць толькі перад смерцю, гучыць яшчэ больш драматычна, вастрэй.

Так складаналась пабудова фільма абарочваецца прастатой, яснасцю думкі. І «Апошнія пісьмы» нямецкіх салдат з-пад Сталінграда даходзяць да адрасата, да людзей 1966 года, выкрываючы захопніцкую вайну, выкрываючы фашызм, які не склаў зброі ні з чым і ні сёння, аб чым сведчаць уключаныя ў фільм прызнанні заходнеберлінскіх школьнікаў, што правялі ў лістападзе 1965 года канікулы ў часцях бундэсвера і напісалі па просьбе часопіса «Штэрн» сачыненне на тэму «Самы шчаслівы дзень канікулаў», дзе можна прачытаць: «Калі мне далі патрымаць аўтамат, я раптам адчуў сябе зусім іншым чалавекам, я адчуў, што магу з аўтаматам у руках заваяваць усю Расію. Я быў сам не свой ад радасці».

Дакументальная стужка «Апошнія пісьмы» не толькі нагадвае пра не такое далёкае мінулае, якое пакінула невылечныя раны ў сэрцы чалавецтва. Фільм заклікае людзей і сёння і заўтра быць пільнымі, каб кашмар фашызму ніколі не змог паўтарыцца.

Барыс ЛЬВОЎ (АДН).

Куток калекцыянера

ВЫДАТНЫ ДЗЕЯЧ РЭВАЛЮЦЫІ

Серыя «Выдатныя дзеячы Камуністычнай партыі і Савецкай дзяржавы» папоўнілася новай маркай, якая прысвечана 80-годдзю з дня нараджэння Грыгорыя Канстанцінавіча Арджанікідзе (1886—1937) — палымянага рэвалюцыянера, бязмежна адданага справе камунізма.

У 17 год ён ужо быў членам Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (бальшавікоў). За актыўны ўдзел у рэвалюцыйным руху Арджанікідзе неаднаразова падвяргаўся арыштам і ссылкам. У гады грамадзянскай вайны ён зняўляўся адным з выдатных палітычных кіраўнікоў Чырвонай Арміі, а потым займаў адказныя дзяржаўныя пасады.

Грыгорыю Арджанікідзе належыць вялікая заслуга ў барацьбе за ператварэнне цяжкай прамысловасці ў магутную базу тэхнічнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі СССР, у будаўніцтве буйных гігантаў першай і другой пяцігодак, у стварэнні металургічнай базы на ўсходзе краіны.

На паштовай мініяцюры ў светла-зялёнай гаме на цёмна-зялёным фоне адлюстраваны партрэт Грыгорыя (Серго) Арджанікідзе.

Арыгінал маркі выкананы мастаком Іванам Дзергілевым. Гравюра на метале Уладзіміра Смірнова. Друк — металаграфія. Цана чатыры капейкі. Зубцоўка лінейная. Памер жывапіснага поля 21,5 на 32,5 міліметра.

МУЗЕЙ— МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР

Цэнтральны музей цыркавога мастацтва атрымаў прасторнае памяшканне ў новым рэканструяваным будынку Ленінградскага цырка.

Музею каля сарака гадоў. Яго экспанаты цікавыя не толькі для мастацтвазнаўцаў, творчых работнікаў, але і для ўсіх аматараў цырка. Наведвальнік знаёміцца з сапраўды унікальнай калекцыяй кніг, выданняў перыёдыкі, афіш, скульптур, карцін, значкоў, медаляў, праграм... Гэта своеасаблівая гісторыя цырка — ад старажытнейшых часоў — яго сапраўды народных вытокаў — да нашых дзён.

Ёсць і экспанаты з асабістага рэквізіту выдатных майстроў мінулага, напрыклад, шамбер'ер выдатнага кіраўніка коннага нумара Вільямса Труцці (пасля рэвалюцыі — першага дырэктара Ленінградскага дзяржцырка), а бронзавая скульптура акрабата — вышэйшы прыз, нядаўна заваяваны савецкімі артыстамі на першым Міжнародным фестывалі цыркавога мастацтва ў Варшаве. Цікавы дыплом Беларускага фізіялагічнага таварыства, выдадзены Валянціну Філатаву «За выключна паспяховае прымяненне ў практыцы дрэсуры прынцыпаў фізіялагічнага вучэння акадэміка Паўлава І. П. аб умоўных рэфлексах».

Музей у Ленінградзе сёння—своеасаблівы метадычны цэнтр цыркавога мастацтва. Сюды звяртаюцца з рознымі просьбамі з Парыжа і Лондана, Берліна і Прагі, гарадоў усіх кантынентаў зямлі. Вось адзін з прыкладаў. Аддзяленне Таварыства германа - савецкай дружбы горада Расток (ГДР) папросіла весткі аб знаходжанні ў Масве ў 1764 годзе нямецкага наезніка Якаба Бейца. Музей адправіў нямецкім гісторыкам фотакопію часопіснага артыкула, дзе падрабязна асвятляецца тэма, якая іх цікавіць. Ажыўленую перапіску вядзе музей з вядомымі аўтарамі кніг пра цырк — Янам Брабецам, Раланам Вайзе. Маркшысам Трыксам, Гайна Зайтлерам, Трыстанам Рэмі, Джузэпе Рываролі і іншымі.

Савецкія артысты, зарубежныя карэспандэнты лічаць сваім абавязкам пашыраць і папаўняць калекцыі. Цікавую літаратуру па гісторыі цырка перадалі музею Юрый Нікулін і Міхаіл Шуйдзін пасля гастроляў у Аўстраліі. Нямала каштоўных экспанатаў падарылі вядомыя майстры манежа — Кіо, Валянцін Філатаў, Алег Папоў, артысты драматычнай сцэны Барыс Ценін і Барыс Тусузаў.

Аляксандр БАСМАНАЎ (АДН).

НА ТЭАТРАЛЬНЫМ ФЕСТЫВАЛІ Ў ВІЛЬНЮСЕ

АФІША зацікавіла нас сваёй незвычайнасцю. На ёй значыліся дзевяць спектакляў розных тэатраў, а ішлі яны ў адным памяшканні — Акадэмічным тэатры драмы Літоўскай ССР. Усё тлумачылася проста — у Вільнюсе праходзіла чарговае фестывальнае свята «Тэатральная вясна».

Правядзенне фестываляў тэатральнага мастацтва стала ўжо традыцыяй у нашых суседзяў. Думаю, няма патрэбы гаварыць аб карысці фестываляў. Тут і абмен думкамі паміж акцёрамі і рэжысёрамі розных творчых калектываў, і стымуляванне росту пастановачнай культуры, і, нарэшце, шырокая зацікаўленасць грамадскасці мастацтвам тэатра. Скажам адразу, вельмі не хапае ўсяго гэтага ў тэатральным жыцці нашай рэспублікі. Ці не пара нам пераняць добры вопыт літоўскіх братоў?

Вільнюскі тэатральны фестываль гэтага года не меў спецыяльнага дэвізу. Але па зместу рэпертуару, па характару пастановачных вырашэнняў адчувалася імкненне як мага шырэй паказаць на сцэне жыццё сучасніка, глыбей раскрыць яго думы і імкненні.

Агляд драматычных тэатраў пачаўся спектаклем гаспадара фестывалю — Акадэмічнага тэатра драмы Літоўскай ССР «Майстар і сыны» па п'есе П. Цвіркі. Майстэрская ігра акцёраў (асабліва выканаўцы галоўнай ролі А. Залянскаса), арыгінальнае рэжысёрскае вырашэнне выклікалі жывую рэакцыю ў зале. Спектакль нібы заклікае сучаснага гледача прыгледзецца да народных традыцый, ацаніць вялікую справу, зробленую папярэднікамі.

«Разліку» з мінулым прысвечаны былі спектаклі «Пяцёра і жонка падсуднага» па п'есе Г. Кановічуса (Клайпедскі драматычны тэатр) і «Тайна Адома Брунзаса» па п'есе І. Грушаса ў пастаноўцы Паневежскага драматычнага тэатра. Апошняя пастаноўка выклікала вялікі грамадскі рэзананс. Аб ёй гаварылі як аб перамозе тэатра, значнай з'яве ў культурным жыцці рэспублікі.

Сюжэт п'есы І. Грушаса вельмі паказальны для сучаснай літоўскай драматургіі. Гэта дыялог з мінулым, як назваў у падзагалоўку свой твор аўтар.

Скульптар Брунзас у час гітлераўскай акупацыі не вытрымаў катаванняў гестапа і выдаў імя актыўнага падпольшчыка, свайго сябра паэта Даўгірдаса. Паэта расстралялі. Брунзас застаецца жыць. Ён любіць жонку свайго загінуўшага сябра, якую неўзабаве арыштоўвае гестапа. У нямецкім канцлагеры Тэрэса нараджае сына, бацькам якога з'яўляецца скульптар Брунзас.

І вось юнак прыязджае ў родны горад, каб заказаць помнік на магілу маці. Аўтарам помніка павінен быць Брунзас. Нягледзячы на некаторую меладраматычнасць сітуацыі, калектыў тэатра здолеў паказаць на сцэне сапраўдны бой чалавека са сваім мінулым у імя сённяшняга дня.

Шаўляйскі драматычны тэатр прывёз на фестываль трагедыю В. Крэве «Шарунас» (рэжысёр М. Карклеліс). Спектакль гэты, нягледзячы на выключную беражлівасць удзельнікаў да гістарычных фактаў і шчырасць выканання, не выклікаў вялікай цікавасці. Ён атрымаўся халодным, аддаленым ад сучаснасці.

Высокую ацэнку публікі і журы агляду атрымаў спектакль «Кароль Алень» К. Гоцы, пастаўлены Клайпедскім тэатрам. Асаблівай пахвалы заслужыў выканаўца ролі Тарталы Б. Бараўскас.

Для дзіцячага гледача тэатры Літвы падрыхтавалі «Юнгу і пірата» па п'есе Ф. Маркунаса (Акадэмічны тэатр драмы), «Рожаса» па п'есе (Б. Кабура; са (Каўнаскі тэатр) і «Глінянага Метэіоскаса» па п'есе К. Кублінскаса (Вільнюскі тэатр лялек).

Фестываль закончыўся спецыяльным абмеркаваннем і ўрачыстым уручэннем узнагарод. Радасныя раз'яджаліся госці дамоў. Творчыя работнікі тэатраў сустрэліся паміж сабой, з гледачамі і паехалі, поўныя новых цікавых задум. Прапаноўвалася, напрыклад, праводзіць тыдні аднаго тэатра на сталічнай сцэне, дэкады нацыянальнага спектакля і г. д.

Ад Мінска да Вільнюса, як кажуць, рукой падаць. Але трэба толькі шкадаваць, што нашы суседскія кантакты пакуль вельмі нязначныя. Мы мала ведаем пра творчыя справы літоўскіх сяброў, недастаткова абменьваемся рэпертуарнымі навінкамі.

У Каўнасе і Мінску пастаўлена трагедыя Шэкспіра «Антоній і Клеапатра». Думаю, цікава і карысна было б абмяняцца тэатрам галоўнымі выканаўцамі.

Творчая садружнасць заўсёды садзейнічала ўзаемаўзбагачэнню мастацтва. Актывізацыя тэатральных кантактаў Літвы і Беларусі павінна стаць у парадак дня нашых кіруючых рэспубліканскіх арганізацый.

А. ЛАБОВІЧ, кандыдат мастацтвазнаўства.

Адбыўся пяты выпуск Рэспубліканскіх пастаянна дзеючых курсаў па падрыхтоўцы кіраўнікоў мастацкай самадзейнасці. 150 чалавек атрымалі накіраванне на работу ў музычныя, драматычныя, танцавальныя і харавыя калектывы. Упершыню выпушчаны навучэнцы аддзялення духавога аркестра.

На здымку — кіраўнік народнага хору вёскі Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Міхаіл Жук здае апошні экзамен па музыцы выкладчыкам курсаў Р. Ліннікавай (злева) і Р. Разлівановай.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

28 чэрвеня

Першая праграма. 16.45—праграма перадач. 16.50—для школьнікаў. «Гном». 17.40—«Машыны абнаўляюць зямлю». (Пра новыя меліярацыйныя машыны і іх выкарыстанне) (М). 18.00—тэлевізійныя навіны (М). 18.15—альманах «Паэзія». Уключэнне Мінска (М). 19.00—«Свет сёння» (М). 19.30—на стадыёнах і спартыўных пляцоўках. Футбол «Тарпеда» (Масква)—«Тарпеда» (Кутаісі) (М). 20.15 — рашэнні XXIII з'езда КПСС—у жыццё. «Пяцігодка горада-героя». Перадача з Адэсы. 20-30—тэлевізійныя навіны (М). 21.00 — І. Расамахін і М. Хейфіц. «Непераможаны вязень». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Ленінграда. 22.30—На III Міжнародным конкурсе імя П. І. Чайкоўскага (М). 23.15—«Расказваюць афішы». Аб гастраліруючых калектывах і артыстах, якія выступяць у Мінску ў ліпені.

Другая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—«Мядзведзіца—рака прыгожая». «Чаканне». Тэлевізійныя фільмы (М). 11.55—для дзяцей. «Падарункі сяброў». «Прыгоды Фэфі». Кінафільмы. 18-00 —тэлевізійныя навіны (М). 18.15—наш кінаглобус. «Дарога лягла на экватар». «Шчаслівага плавання, Гана!» Дакументальныя фільмы. 19.20—«Зачараваная Дзясна». Мастацкі фільм. 20.50—П. І. Чайкоўскі. Першы канцэрт для фартэпіяна з аркестрам.

29 чэрвеня

Першая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—урачыстае закрыццё Міжнароднага конкурсу імя П. І. Чайкоўскага. У перапынках—тэлевізійны часопіс «Навука—вытворчасці» і «Панарама Радзімы» (М). 21.00—тэлевізійныя навіны (М). 21.30—«Наш равесник». Маладзёжная праграма. 22.20—«У свеце танца». Тэлевізійны часопіс.

Другая праграма. 11.00—тэлевізійныя навіны (М). 11.15—для школьнікаў. «Дзяўчынка і кракадзіл». Мастацкі фільм (М). 12.20—школа пачынаючага спартсмена (М). 18.30—«Пошук працягваецца». Кінанарыс. 18.50—«Страх і роспач у Трэцяй імперыі». Тэлевізійны спектакль. 21.25—рэклама, аб'явы. 21.30—«Веды». Навукова-пазнавальная праграма. Перадача з Тбілісі. 22.00 — у эфіры—«Маладосць». «Арбіта», Перадача з Кіева.

30 чэрвеня

Першая праграма. 16.55—праграма перадач. 17.00—для малодшых школьнікаў. «Прыходзь, казка!» Перадача з Ленінграда. 17.50—«Наша пошта». 18.15—канцэрт лаўрэата міжнародных конкурсаў В. Шацкага (фартэпіяна.) 18.35—«З эмблемай «ДІЗ». Пра калектыў фізкультуры Мінскага падшыпнікавага завода. 19.00—спектакль Растоўскага драматычнага тэатра імя М. Горкага. У перапынку—тэлевізійныя навіны. 22.00—па вашых просьбах. А. Дворжак. «Мелодыя». 22.20—турнір дапытлівых. «Каляндар-віктарына». 23.00—«Прывал у даліне ракі Олта». Канцэрт народнай румынскай музыкі. Перадача з Бухарэста.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

Калектыў Рэспубліканскага Дома народнай творчасці глыбока смутнуе з прычыны смерці рэжысёра народнага тэатра Мінскага аўтазавода, заслужанага артыста Казахскай ССР Арбеніна Канстанціна Ананьевіча і выказвае спачуванне яго родным і блізкім.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры—3-22-04, аддзела інфармацыі—3-44-04, карэспандэнцкага пункта ў Гомелі—2-70-83, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі—6-97-44.

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда». Індэкс 63856. АТ 00990

БРАТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— А воласць ты забыў?

— Дык гэта ж бандзіты.

— Зараз і не пра бандзітаў скажу. А як Цімоша каўбасы ў Несцера пазнімаў на гары, ты помніш?

— Ну, помню.

— А як Палікар у Богута капу сена хацеў украсці на Марачанцы, ды той злавіў, помніш?

— Ну.

— Ды як яны адзін аднаму граблямі галовы паразбівалі? Помніш?

— Ну, помню. Толькі не граблямі, а вілами.

— Не тое самае! А Таклюсю Варывончыкаву не знайшлі на разоры забітую за тое, што яна жменю жыта вырвала?

— Ну, знайшлі.

— А ты забыў, як Стафана Ката́ на кааператыўным ганку ноччу забілі ды лаўку абчысцілі?

— Чаму я забыў? Я нічога не забыў. Было, канечне, і тады...

— А не замыкаліся гэтак, бо не было чаго браць. Посцілка дзіравая ці вашывы кажух некаму патрэбны былі? Усяго і багацця было ў хаце, што скрыня з палотнамі. Нябось, Сядуры замыкаліся, яшчэ і як замыкаліся. Мала замкоў — дык сабаку прывязвалі, каб бегаў на дроце з канца ў канец па двары. Можа няпраўда, скажаш?

— Чаму няпраўда? Праўда. Было гэтак. Шмігельскія дваіх прывязвалі, аднаго каля хаты, другога каля гумна. То раз ваўкі былі знялі аднаго з ланцуга. Можа і не помніш? За Мікалаем яшчэ было.

Не пра гэта Мацвею хацелася гаварыць з братам: звялася гаворка чорт ведае на што. Усякія людзі былі і тады і цяпер. Жыць трэба ўмець. А што гэта — умець? А як гэта — умець? Мацвей кіўнуў Андрэю на чарку і, не чакаючы яго, выпіў.

— Не ўмею я,— заняпалым голасам сказаў.— Як усё роўна рызінаю мяне хто звязаў: хачу выпрастацца, а яна мяне сціскае, а яна мяне сціскае. Каб сказаў, якая хвароба ў мяне была, дык не, здаровы я.

— Бязвольнасць — гэта сама большая хвароба,— заўважыла Марына.

— Маўчы ты! Дай з братам пагаварыць!

— Чаго ж ты? Марына сказала праўду...

— Ведае яна! — Мацвей зазлаваў.— Ну, а як, як я павінен?

— Не ведаю, як ты павінен. Самому відней. Каб давялося мне, то я б гэту трубу,— Андрэй паказаў рукам галавы высока на сцяну, дзе вісела старэнькая, пагнутая валторна,— узяў бы ды прадаў.

— А што тут дрэннага, што я пайграю калі?

— Як быццам нічога, а вот дрэнна, для цябе гэта дрэнна, Мацвей. Калі б гэта ў вас быў які гурток, вечары самадзейнасці наладжвалі... Гэта я разумею. Гэта добра.

— І, самадзейнасць есь,—падхапіў Мацвей.

— Якая? Калі? Раз у год? А ўсё тваё жыццё праходзіць ад вяселля да вяселля. Двое сутак там,— пі, еш,— двое — на пахмелку за заробленыя грошы. А там — галава баліць пасля п'янкі...

— Праўда, Андрушачка, праўда,— падтрымлівала Марына.

— Парабіў адзін дзень у калгасе — а там і на новае вяселле завуць. Калі ж воз дроў прывезці? Аб дзецях паклапаціцца? А гаворыш на Сароку, яна тое, яна гэта... Ты правільна сказаў: жыць трэба ўмець. Вот гляджу я на цябе — жыццё ў цябе нейкае пустое: абы пражыў дзень, і добра. А заўтра бог дасць. Мне здаецца, ты часам выходзіш з хаты і не ведаеш, куды пайсці, чаго пайсці, але ідзеш. І зусім выпадкова цябе хто-небудзь зазаве на чарку, і ты зойдзеш, і нечакана для самога сябе вып'еш. Не заўсёды — гэта чарка. Бывае, і на харошае людзі накіруюць. Але ж таксама выпадкова. Я вот бачыў — страха ў цябе падладжана свежай саломай. А гэта як? Нехта сказаў: «Вазьмі ў мяне пару кулёў — засталіся — ды падладзь сабе хату, цячэ?» То вот ты ўзяў і падладзіў.

— Усё праўда, Андрушачка, усё праўда, што ты гаворыш.

— Усё жыццё тваё трымаецца на выпадках. Запытай у цябе, а ты і не ведаеш, што ты заўтра будзеш рабіць.

— І не ведаю! І не буду ведаць! — закрычаў Мацвей.— Бо за мяне думаюць! Каб у мяне была свая зямля, то я б думаў. Я б ведаў, куды я заўтра пайду і што буду рабіць. А за гэтымі вашымі калгасамі чалавеку, хоць бы хацеў, то не даюць думаць! Кожны камандаваць любіць табою.

— А ты так зрабі, каб не трэба было табою камандаваць, каб з табою раіліся.

— Ого, яна параіцца!

— І правільна, што яна не раіцца з табою! З кім раіцца? З тым, хто на працу не ходзіць, а па вяселлях ездзіць, калі другія працуюць? Раіцца трэба з тым, хто душу аддае калгасу, хто звязаў свой лёс з ім. Вот з кім трэба раіцца, а не з табою.

— Многа такіх знойдзе.

— Кожны чалавек павінен знайсці сваё месца ў жыцці, быць цаглінай у сцяне, а не каменем на дарозе. Камень на дарозе ляжыць да пары да часу, пакуль хто нагу не саб'е. А тады — у смярдзючую канаву яго, на абочыну. Не працуеш— не замінай. Вот як!

— Занадта многа каменьчыкаў будзе прыбіраць.

— Нічога, мятла падмяталы ды шланг з вадою справяцца. Усё сплыве.

— Можа так сплысці, што нікога не застанецца. Маладыя і так усе ў горад уцякаюць.

— Уцякаюць датуль, пакуль горад прымае, а там перастануць—пачнуць дома шукаць жыцця.

— Знойдзе дома. А чаму, скажы ты мне, павінен канечне так жыць, як некаму хочацца? Хоць бы таму самаму Сталіну? Я гэта табе смела скажу!

— А ніхто цябе і не прымушае жыць так, як нехта хоча. Жыві сабе, як хочаш. Але вот працаваць на зямлі ты мусіш так, як ад цябе патрабуе грамадства.

— Чаму?!

— Таму што, акрамя